Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. ПЯТНІЦА № 194 (28304)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Хваля холаду з поўначы**

СТАР. 3



**Заправіць машыну… па-беларуску**

СТАР. 4



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

# СПАДАРОЖНАГА ВЕТРУ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Нават у кастрычніку аматары кайтсёрфінга — катання на вадзе с дапамогай паветранага змея — працягваюць спартыўны сезон на Браслаўскіх азёрах.** (Здымак зроблены на возеры Дрывяты.)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Павышэнне пенсійнага ўзросту ў нас прадугледжана з 1 студзеня 2017 года, таму, вядома, прыкметнага ўплыву на пазабюджэтны фонд сацыяльнай абароны насельніцтва мы яшчэ не ўбачым. Але мы разлічваем, што ў нас павялічыцца колькасць занятых у эканоміцы. Вельмі важна, каб выконваўся артыкул Працоўнага кодэкса, які звальненне чалавека па прычыне дасягнення пенсійнага ўзросту разглядае як дыскрымінацыю. Дарэчы, сёння ў нас працуе 660 тыс. пенсіянераў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9156 | ▼ |
| Еўра | 2,1451 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0307 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0740 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

## РАБОТА ПАРЛАМЕНТАРЫЯЎ — У ІНТАРЭСАХ ЧАЛАВЕКА

*Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Мясніковіча М. У. на закрыцці дванаццатай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання 6 кастрычніка 2016 года*

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Сёння завяршае сваю работу дванаццатая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.



За чатыры гады работы Савета Рэспублікі беларускага парламента зроблена нямала. Наша дзейнасць стала больш прыкметнай у грамадстве, больш разнастайнай па коле вырашаемых пытанняў. Актывізавалася супрацоўніцтва Савета Рэспублікі з рэгіёнамі: Саветамі дэпутатаў, выканкамамі, працоўнымі калектывамі. Маладзёжная тэматыка заняла значную ролю ў мерапрыемствах, праводзімых Саветам Рэспублікі, яго Прэзідыумам, Саветам па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання і ў рамках асобных праектаў. Устойлівы характар набылі кантакты з расійскімі калегамі, парламентарыямі іншых краін.

Удасканаленне заканадаўства садзейнічала дэмакратызацыі грамадскіх адносін. Для атрымання зваротнай інфармацыі аб эфектыўнасці законаў мы пачалі праводзіць маніторынг практыкі іх прымянення. На працягу 2014—2016 гадоў вывучана больш за 20 законаў, унесены прапановы па іх карэкціроўцы.

Прадстаўнічы склад удзельнікаў, які ўзрастае з кожным годам, пераканаўча доказвае асаблівую ролю ўзаемадзеяння рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў развіцці Саюзнай дзяржавы. Высокі статус гэтым маштабным мерапрыемствам надае ўдзел у іх прэзідэнтаў нашых краін, глыбокапаважаных Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі і Уладзіміра Уладзіміравіча Пуціна.

СТАР. 3

## ЗАДАЧЫ, ПАСТАЎЛЕНЫЯ КРАІНАЙ, ВЫКАНАНЫ

*Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанкі У. П. на закрыцці дзясятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання 6 кастрычніка 2016 года*

Паважаныя калегі!



Мы разгледзелі ўсе пытанні парадку дня. Дзясятая заключная сесія Палаты прадстаўнікоў пятага склікання падыходзіць да завяршэння. Разам з ёй мы перагортваем яшчэ адну старонку ў гісторыі беларускага парламента.

Задачы, пастаўленыя перад намі, выкананы. Дзейнічаючы ў рэчышчы агульнай дзяржаўнай стратэгіі і ўстановак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутацкі корпус працаваў на развіццё эканомікі, умацаванне бяспекі і захаванне дастойнага ўзроўню жыцця грамадзян. Гэтым мэтам сёння служаць больш як 400 запатрабаваных дзяржавай і грамадствам законаў.

Шмат зроблена для забеспячэння макраэканамічнай стабільнасці, умацавання фінансавай і банкаўскай сістэм. Спрошчаны ўмовы гаспадарання. Прыняты дадатковыя меры па паляпшэнні інвестыцыйнага клімату. Створаны сур'ёзны задзел для выбудоўвання партнёрскіх адносін дзяржавы і бізнесу. Вялікую ролю парламентарыі адыгралі і ў фарміраванні прававой базы ЕАЭС, сканцэнтраваўшы намаганні на абароне айчынных вытворцаў і пашырэнні нацыянальных інтарэсаў на еўразійскім рынку.

СТАР. 3

# Завяршыўся афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі ў Пакістан

**Самалёт кіраўніка дзяржавы вылецеў з авіябазы «Нур Хан», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўніка беларускай дзяржавы да трапа самалёта праводзіў прэм'ер-міністр Пакістана Наваз Шарыф.

Адбылася нефармальная сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніком урада Пакістана ў яго загараднай рэзідэнцыі. Яна прайшла ў цёплай атмасферы, бакі абмяняліся падарункамі.

А напярэдадні адбылася сустрэча Прэзідэнта Беларусі са спікерам Нацыянальнай асамблеі парламента Пакістана Сардарам Садзікам.

На сустрэчы было адзначана, што пытанні развіцця двухбаковых адносін паміж краінамі не трэба аддаваць толькі на водкуп урадам. «Тое, што могуць і павінны парламенты, ніколі не зробяць урады, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Работа і супрацоўніцтва парламентаў — гэта вышэйшая ступень народнай дыпламатыі».

У сваю чаргу, Сардар Садзік звярнуў увагу, што Беларусь і Пакістан рэгулярна абменьваюцца візітамі на розных узроўнях. Так, у бліжэйшы час спікер Нацыянальнай асамблеі мае намер запрасіць у сваю краіну кіраўніцтва беларускага парламента.

Аляксандр Лукашэнка таксама правёў у Ісламабадзе перагаворы з Прэзідэнтам Пакістана Мамнунам Хусэйнам. Сустрэча прайшла ў афіцыйнай рэзідэнцыі кіраўніка пакістанскай дзяржавы «Айван-е-Садр».

# Аляксандр Лукашэнка наведаў магілу Іслама Карымава ў Самаркандзе

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыбыў з рабочым візітам ва Узбекістан. Самалёт кіраўніка дзяржавы, рухаючыся па маршруце Ісламабад — Мінск, прызямліўся ў аэрапорце Самарканда, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.**

Каля трапа самалёта Аляксандра Лукашэнку сустрэў выконваючы абавязкі Прэзідэнта Узбекістана, прэм'ер-міністр краіны Шаўкат Мірзіяеў.

Кіраўнік дзяржавы наведаў могілкі «Хазрат Хізр», размешчаныя побач з мемарыяльным комплексам Шахі Зінда, і ўсклаў кветкі на магілу Іслама Карымава. Затым прысутныя ўшанавалі памяць першага Прэзідэнта Узбекістана мінутай маўчання.

Шаўкат Мірзіяеў расказаў Прэзідэнту Беларусі аб гісторыі могілак «Хазрат Хізр» і мемарыяльнага комплексу. Затым Аляксандр Лукашэнка накіраваўся ў Палац форумаў, дзе ўсклаў вянок да фатаграфіі Іслама Карымава.

Тут жа кіраўнік дзяржавы паразмаўляў з удавой Таццянай Карымавай і выказаў ёй свае спачуванні.

■ Узаемаадносіны

# Беларусь і Узбекістан маюць вялікі патэнцыял для развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў у час рабочай сустрэчы з выконваючым абавязкі Прэзідэнта Узбекістана, прэм'ер-міністрам краіны Шаўкатам Мірзіяевым, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Мы крыху адсталі ў адносінах, у эканоміцы. Упэўнены, што ў бліжэйшы час — год, два, тры — мы абавязкова адыдзем ад гэтага смешнага тавараабароту. У нас ёсць велізарны патэнцыял. Мы маем патрэбу ў вас, вы маеце патрэбу ў нашай эканоміцы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Таму мы дамовімся і вызначым рамкі нашага афіцыйнага візіту, калі вы сфарміруеце ўрад, праведзяце прэзідэнцкія выбары».

Прэзідэнт расказаў, што сёння павінен быў пачацца яго афіцыйны візіт ва Узбекістан. «Я загадзя не думаў і не падбіраў гэты момант. Толькі сёння ў самалёце адкрыў і паглядзеў: дык мы ж 6—8 кастрычніка збіраліся сустрэцца тут з Ісламам Абдуганіевічам і абмеркаваць нашы праблемы, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Вядома, гэты візіт не такім павінен быў быць, але жыццё ідзе і прадыктуе. Наша з вамі задача — зрабіць так, каб узбекскі і беларускі народы мелі дастойныя ўзаемаадносіны. І мы гэта зробім. Гэта будзе добрай для яго памяццю».

У сваю чаргу, Шаўкат Мірзіяеў падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за прыезд у Самарканд і тую шчырую падтрымку, якую кіраўнік дзяржавы і Беларусь аказваюць Узбекістану. «Беларусь — гэта наш надзейны, шчыры, даўні партнёр, дружалюбная краіна, — падкрэсліў прэм'ер-міністр. — Той тавараабарот, які сёння паміж намі існуе, не задавольвае ні вас, ні нас. Мы павінны знайсці тыя агульныя падыходы, каб ён вырас» ■

■ Энергетыка

# ДА АЦЯПЛЯЛЬНАГА СЕЗОНА ГАТОВЫЯ НА 100%

**На думку першага намесніка міністра энергетыкі Леаніда ШЭНЦА, наша краіна цалкам гатовая да ацяпляльнага сезона. Акрамя таго, падчас канферэнцыі ў прэс-цэнтры БЕЛТА напярэдадні XXI Беларускага энергетычнага і экалагічнага форуму, які пройдзе з 11 па 14 кастрычніка ў сталіцы, спецыялісты абмеркавалі пытанні энергетычнай бяспекі краіны, выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі.**

## Газу на зіму хопіць усім

Па словах Леаніда Шэнца паводле кантракта, які падпісалі паміж сабой «Белтрансгаз» і «Газпром трансгаз Беларусь» на 2015—2017 гады, у бягучым ацяпляльным перыядзе аб'ём паставак прыроднага газу складзе 19,3 млрд куб. м. Гэтага будзе дастаткова для забеспячэння як насельніцтва, так і прамысловых прадпрыемстваў. Запасы мазуту таксама нарыхтаваны ў поўным аб'ёме — 354 тыс. тон (план 350 тыс. тон). Дастаткова нарыхтавана і торфу, што дасць магчымасць забяспечыць суседзяў у сельскай мясцовасці. Для павышэння ўстойлівасці ліній электраперадачы 6—10 кВ выканана іх планавая рэканструкцыя з прымяненнем абароненых правадоў. Таксама ўжо прыбраны дрэвы, якія могуць зваліцца на лініі. «Такім чынам ужо на 1 кастрычніка практычна 100% нашых спажыўцоў і цеплакрыніц гатовыя да асенне-зімовага перыяду», — растлумачыў Леанід Шэнец.

Акрамя таго, ён расказаў, што Міністэрства энергетыкі і кампанія «Сіменс» абмяркоўваюць магчымасць рэалізацыі ў Беларусі новых сумесных праектаў. Ужо падпісана рамачнае пагадненне аб супрацоўніцтве з гэтай кампаніяй і будзе створана рабочая група з удзелам прадстаўнікоў Мінэнерга, «Белэнерга» і кампаніі, каб арганізаваць вытворчасць асобных вузлоў і дэталяў на прадпрыемствах у Беларусі. Бакі абмяркоўваюць таксама магчымасць стварэння сучаснага сэрвіснага цэнтра.

## Перспектыва аднаўляльных крыніц

**Намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ігар КАЧАНОЎСКІ** адзначыў, што ў адпаведнасці з канцэпцыяй экалагічнай і энергетычнай бяспекі краіны да 2035 года ў Беларусі вытворчасць электраэнергіі з выкарыстаннем аднаўляльных крыніц складзе 2,6 млрд кВ/г у год. «З улікам павелічэння сусветнага дэфіцыту і пастаяннага падаражання традыцыйных энерганосьбітаў неабходна іх замяшчаць мясцовымі і аднаўляльнымі відамі паліўна-энергетычных рэсурсаў», — растлумачыў ён.

Аднаўляльнымі крыніцамі энергіі з'яўляюцца сонца, вецер, рух водных патокаў, біягаз і біямаса. Спецыяліст расказаў, што ў краіне колькасць установак па вытворчасці электрычнай і цеплавой энергіі з выкарыстаннем гэтых крыніц расце з кожным годам. Сёння ўжо функцыянуе звыш 650 падобных установак агульнай магутнасцю больш за 1 тыс. МВт. Сярод перспектыўных напрамкаў — комплексная перапрацоўка арганічных камунальных адходаў, ападкаў ачышчальных збудаванняў сцёкавых водаў, адходаў аграпрамысловага комплексу, біямасы для атрымання біягазу, павелічэнне выкарыстання энергіі ветру і сонца праз паэтапнае ўкараненне ветраўстановак і сонечных батарэй. «Толькі за кошт пашырэння выкарыстання энергіі ветру, біягазу і адходаў патэнцыял эканоміі складзе больш за 2,5 млн тон умоўнага паліва, або 11,9% імпартаванага за 2015 год прыроднага газу», — адзначыў ён.

## Энергія з адходаў

Па словах Ігара Качаноўскага, атрыманне энергіі перспектыўна развіваць і за кошт большага выкарыстання паліўнай дранкі, спальвання камунальных адходаў на спецыялізаваных ЦЭЦ або на заводах па спальванні смецця, будаўніцтва якіх запланавана ў наступныя гады ў прыгарадах Мінска.

Ён таксама расказаў, што Мінпрыроды сёння прапануе разгледзець магчымасць выключэння адпрацаваных масляў з пераліку мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсаў. Гэтыя адходы плануюць збіраць з мэтай вытворчасці на іх аснове імпартазамяшчальнай прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю для розных галін эканомікі. Паўторнае іх выкарыстанне вельмі перспектыўнае і павінна прынесці вялікі даход у бюджэт краіны.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by* ■

**У тэму**

Як адзначыў **міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр ЦЕРАХАЎ**, узгадненне на ўключэнне ацяплення ўжо падпісана. Аднак гэта — паэтапная работа. У першую чаргу цяпло з'явіцца ў дашкольных установах, школах, медыцынскіх установах, а ўжо потым — у жыллёвым фондзе. «Ацяпленне будзе ўключана ў тым ці іншым рэгіёне ў адпаведнасці з рашэннямі выканкамаў па ўзгадненні з міністэрствам. Такое ўзгадненне мы ўжо падпісалі», — адзначыў Аляксандр Церахаў.

Школы, дзіцячыя сады і некаторыя іншыя ўстановы Віцебскай вобласці ацяпляюцца з 5 кастрычніка. З 6 кастрычніка ва ўсіх раёнах Гродзенскай вобласці, а таксама ў Мінску, прыступілі да падачы цяпла ў аб'екты сацыяльнай сферы. У Брэсцкай вобласці батарэі ацяплення «ажывуць» 7 кастрычніка. Жылфонд у Магілёўскай вобласці пачне абагравацца ў канцы гэтага тыдня.

■ Спажывец

# НЕ НА КАРЫСЦЬ ПАКУПНІКА?

**У пачатку года ў інспекцыю Дзяржстандарта па Мінскай вобласці і Мінску нярэдка паступалі званкі-скаргі ад спажыўцоў, маўляў, абважылі на рынку. Інспектары аператыўна рэагавалі на такія скаргі і выязджалі на месцы. Як высвятлялася ў ходзе праверак — камплект парушэнняў быў вялікім. Усяго з пачатку гэтага года інспекцыяй правераны стан і правільнасць прымянення вагавымяральнага абсталявання ў 118 гандлёвых аб'ектах. Парушэнні выяўлены ў 92 з іх. З правераных 259 адзінак вагаў амаль палова аказаліся не паверанымі або тэхнічна няспраўнымі. Менавіта на такіх прыладах прадукцыя ўзважвалася і адпускалася ў гандлёвым гарадку «Лябяжы» Гандлёвага дома «Ждановічы», «Выставачным цэнтры «Аквабел» (Мінскі раён), на тэрыторыі таварыства ўласнікаў «Гандлёвы комплекс на вул. Каліноўскага, 55 Д-Г» (міні-рынак).**



...Мы накіроўваемся на чарговую праверку вагавага абсталявання на тэрыторыю гандлёвага гарадка «Лябяжы». Тут прылаўкі ломяцца ад багацця рознай садавіны і агародніны. Падыходзім да аднаго з іх, на ім размясціліся дыні і кавуны. Аднак шалі, на якіх іх узважваюць, па словах інспектараў, да работы непрыгодныя. І парушэнняў тут хапае: шалі не ўнесены ў Дзяржаўны рэестр сродкаў вымярэнняў Рэспублікі Беларусь, размешчаны на няўстойлівай аснове, у іх рваная клавіятура вагаў. Названыя парушэнні не гарантуюць дакладнасць праведзеных вымярэнняў і могуць прывесці да абважвання і абліку пакупнікоў.

Рухаемся далей. Наступны прадавец таксама не стаў выключэннем з правілаў. Інспектары канстатуюць: шалі ўстаноўлены на няўстойлівай аснове — скрынях (у гэтым выпадку налічылі 6 штук), шалі хістаюцца ад аднаго толькі дотыку. Пры куплі тавару на такой кропцы могуць абважыць і на 5, і на 10 грамаў.

Аднак прадавец здзіўляецца: «Дзе на рынку можна знайсці цвёрдую аснову? Гэта ж вызяны гандаль, а не стацыянар!»

— У краіне ёсць «Правілы карыстання сродкамі вымярэння ў сферы гандлёвай дзейнасці», дзе дакладна прапісана, якім чынам ажыццяўляецца гандлёвая аперацыя з выкарыстаннем вагавымяральнага прыбора, — падкрэслівае **начальнік аддзела дзяржаўнага метралагічнага нагляду інспекцыі Дзяржстандарта па Мінскай вобласці і Мінску Рыта ЧАРКАС**. — І гэтыя правілы неабходна ведаць, калі ажыццяўляеце гандлёвыя аперацыі з вагавым абсталяваннем. Скрыні або каробка цвёрдай асновай не з'яўляюцца. Неабходна ўстанавіць металічныя падстаўкі.

За невыкананне правілаў карыстання вагамі нядобрасумленным прадаўцам пагражае штраф ад 10 да 30 базавых велічынь.

Інспектар таксама нагадвае, што вагі павінны праходзіць праверку адзін раз у год у арганізацыях дзяржаўнай метралагічнай службы. Акрамя гэтага, на вагі павінна быць нанесена галаграфічная наклейка, прычым так, каб яе бачыў пакупнік. Яна сведчыць аб тым, што прылады прайшлі праверку. Дарэчы, у 2016 годзе такая наклейка мае серабрысты колер. На яе наяўнасць варта звяртаць увагу пры здзяйсненні пакупак, асабліва на рынках.

«Праўда, дапускаецца, што на вагах, якія выраблены ў гэтым годзе, наклейкі можа і не быць. Гэта значыць, што яны былі правераны пры выпуску з вытворчасці», — кажа Рыта Чаркас.

У «правільных» вагах зацікаўлена і кіраўніцтва рынкаў.

— Мы арганізоўваем праверку два разы на год. Запрашаем спецыялістаў Беларускага дзяржаўнага інстытута метралогіі, яны праводзяць тэхнічны агляд і ажыццяўляюць праверку, — адзначае **намеснік начальніка камерцыйнага аддзела №2 адміністрацыі Гандлёвага Дома «Ждановічы» Дзмітрый АЎРАЙЦЭВІЧ**.

«Пасля правядзення агляду гандлёвых месцаў інспектары афармляюць акты праверак, выпісваюць пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях, а затым накіруюць іх у судовыя органы. Да актаў таксама будуць прыкладзены рэчавыя доказы — фатаграфіі неправераных вагаў», — падкрэслівае Рыта Чаркас.

**— Рыта Ягораўна, падкажыце, ці ёсць дынаміка паляпшэнняў пры праверках вагаў?**

Хацелася б адзначыць, што ў параўнанні з мінулым годам на рынках краіны парушэнняў пры выкарыстанні вагавымяральнага абсталявання стала менш. Так, сярод станоўчых прыкладаў — рынак «Серабранка» ААТ «ФАБЭКС». Пры яго праверцы ў чэрвені гэтага года ўсе шалі былі правераны, устаноўлены па ўзроўні, а ў 2015 годзе пры першай праверцы былі складзены пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях.

**ПАРАДЫ ПАКУПНІКАМ:**

**Пры куплі тавару звярнуць увагу на наяўнасць на вагах галаграфічнай налепкі з боку пакупніка, якая сведчыць аб праходжанні праверкі. Вагі павінны быць устаноўлены на цвёрдай аснове, іх нельга загрувашчваць таварам. Дадаткова можна ўзважыць тавар на кантрольных вагах, усталяваных на тэрыторыі рынкаў.**

**У выпадку абважвання аператыўна звярнуцца ў адміністрацыю рынку. Не купляйце вялікую колькасць харчовай прадукцыі на адной гандлёвай кропцы — так больш складана ўсачыць за вагой шматлікіх пакупак.**

**Дар'я ГАСЦІЛОВІЧ,** ■

# РАБОТА ПАРЛАМЕНТАРЫЯЎ — У ІНТАРЭСАХ ЧАЛАВЕКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Саветам Рэспублікі набыты рознабаковы вопыт парламенцкай дыпламатыі, заснаваны на прынцыпах шматвектарнасці знешняй палітыкі і міжнароднага права. Пашырана геаграфія міжнародных парламенцкіх сувязей, актывізаваны кантакты на еўрапейскім напрамку, на якасна новы ўзровень выйшла двухбаковае ўзаемадзеянне з заканадаўчымі органамі Індыі, Сербіі, Турцыі, Амана, Шры-Ланкі, Кітая, Інданезіі, М'янмы і шэрага іншых дзяржаў.

Высокапрафесійная і канструктыўная дзейнасць парламентарыяў пятага склікання садзейнічала эфектыўнаму дыялогу ўсіх галін улады, захаванню міру і грамадзянскай згоды ў грамадстве, палітычнай стабільнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

Паважаныя калегі!

За час работы ў парламенце вы атрымалі салідны вопыт заканатворчай, міжпарламенцкай, кіраўніцкай дзейнасці. Спадзяюся, што вы прымяніце яго на адказных пасадах, якія сёння займаеце і будзеце займаць у будучым.

Мы разлічваем, што вы падзеліцеся гэтым вопытам з нававыбранымі членамі Савета Рэспублікі, прадоўжыце займаць актыўную грамадзянскую пазіцыю і застанецеся для Савета Рэспублікі надзейнымі памочнікамі ў сваіх рэгіёнах.

Дзякуй вам за работу. Жадаю вам, вашым родным і блізкім здароўя, дабрабыту, поспехаў ва ўсіх вашых справах.

# ЗАДАЧЫ, ПАСТАЎЛЕНЫЯ КРАІНАЙ, ВЫКАНАНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Новыя выклікі рэгіянальнай бяспецы прадыктавалі неабходнасць умацавання суверэнітэту, абараназдольнасці і падтрымання грамадскага парадку. У краіне дзейнічае новая Ваенная дактрына. Праваахоўныя органы атрымалі больш эфектыўныя інструменты па барацьбе з наркабізнесам і карупцыяй. Захаванню даверу грамадства да ўлады садзейнічала змяненне заканадаўства аб зваротах грамадзян.

Нягледзячы на строгія падыходы да фарміравання бюджэтна-падатковай палітыкі, пытанні сацыяльнай абароны заўсёды заставаліся ў цэнтры ўвагі дэпутацкага корпуса. Узмоцнены гарантыі дзяржаўнай падтрымкі найменш абароненых катэгорый грамадзян. Абноўлена заканадаўства ў сферах аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту. Прынцыповае значэнне надавалася ўдасканаленню маладзёжнай і сямейнай палітыкі, забеспячэнню дэмаграфічнай бяспекі краіны. Заканадаўчае развіццё атрымала канстытуцыйнае права грамадзян на альтэрнатыўную службу.

Мы актыўна прадаўжалі работу па кадыфікацыі, прыняўшы новыя Водны і Лясны кодэксы, Кодэкс аб культуры. Былі ўзмоцнены падыходы да вывучэння практыкі прымянення законаў. Ініцыятывы дэпутатаў замацаваны ў мытным і працоўным заканадаўстве, рашэннях па пытаннях аграпрамысловага комплексу, транспартнай і турыстычнай сфер.

У мэтах аператыўнага разгляду законапраектаў было наладжана цеснае супрацоўніцтва з Адміністрацыяй Прэзідэнта, Саветам Рэспублікі, урадам. Асаблівы акцэнт быў зроблены на якасці нашай работы. Дастаткова сказаць, што больш за палавіну праектаў былі значна перапрацаваны пастаяннымі камісіямі. Акрамя таго, стабільнасці заканадаўства садзейнічала практыка аб'яднання некалькіх законапраектаў па адным і тым жа пытанні ў адзіны дакумент.

Рэзультатыўнай была і наша міжнародная дзейнасць. У Палаце прадстаўнікоў праведзена звыш 200 міжнародных сустрэч, нас наведалі больш як 30 парламенцкіх дэлегацый. Геаграфія кантактаў налічвае больш за 50 краін свету. Дагаворная база міжпарламенцкага супрацоўніцтва папоўнілася 10 новымі пагадненнямі.

Безумоўным прыярытэтам для нас было ўмацаванне інтэграцыйных сувязей на постсавецкай прасторы. Улічваючы перавагі інтэграцыі, мы імкнуліся выкарыстоўваць парламенцкія пляцоўкі Саюзнай дзяржавы, СНД і АДКБ для нарошчвання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

Адначасова мы актыўна шукалі саюзнікаў на далёкай дузе. У нас склалася стратэгічнае партнёрства з парламентам Кітая. Трывалыя, даверныя адносіны нас звязваюць з калегамі з В'етнама, Індыі, Інданезіі, Камбоджы, Лаоса, М'янмы, Тайланда. Гэтаму ў немалой ступені садзейнічала прадастаўленне ў 2011 годзе Нацыянальнаму сходу статусу наглядальніка ў Міжпарламенцкай асамблеі АСЕАН. Паслядоўная, мэтанакіраваная работа дэпутатаў пятага склікання дала магчымасць нам атрымаць такі ж статус у Лацінаамерыканскім парламенце.

Дзякуючы намаганням кіраўніка дзяржавы Беларусь стала перагаворнай пляцоўкай для вырашэння пытанняў рэгіянальнай бяспекі. Гэта адкрыла магчымасці для актывізацыі парламенцкай дыпламатыі на заходнім вектары.

Аб росце міжнароднага аўтарытэту Нацыянальнага сходу і краіны ў цэлым сведчыць тое, што 26-я сесія Парламенцкай асамблеі АБСЕ пройдзе наступным летам у Мінску. Упершыню ў беларускай сталіцы збяруцца больш як 700 палітыкаў з 57 краін свету.

Актыўнае развіццё дыялогу з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора заклала добрыя перспектывы для нарошчвання ўзаемадзеяння з краінамі гэтай арганізацыі. На якасна новы ўзровень выходзіць беларуска-польскае супрацоўніцтва. Сустракаючыся з нашымі калегамі з Балгарыі, Германіі, Іспаніі, Румыніі, Сербіі, Славакіі, Францыі, Чэхіі, мы бачым шчыры, непадроблены інтарэс да нашай краіны і гатоўнасць да сумесных работы.

Залогам паспяховай заканадаўчай і міжнароднай дзейнасці з'яўляюцца пастаянная сувязь з выбаршчыкамі, дакладнае ўяўленне аб стане спраў у рэгіёнах. За чатыры гады дэпутатамі прынята звыш 50 тыс. чалавек, разгледжана больш за 53 тыс. зваротаў грамадзян. Найбольш вострыя тэмы, узнятыя насельніцтвам, станавіліся прадметам дыскусій з урадам і нярэдка клаліся ў аснову карэкціроўкі заканадаўства.

Сумесна з мясцовымі органамі ўлады дэпутаты вырашалі пытанні развіцця тэрыторый, занятасці насельніцтва, стварэння новых рабочых месц. Напрыклад, у выніку дэпутацкай ініцыятывы толькі ў трох сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці было падрыхтавана больш за 30 бізнес-праектаў.

Галоўнай мэтай дабрачынных акцый, праведзеных у выбарчых акругах, з'яўлялася падтрымка ветэранаў, інвалідаў, маламаёмных грамадзян, дзяцей са шматдзетных сем'яў.

Дэпутаты стараліся быць у гушчы падзей, стаўшы зачынальнікамі многіх добрых спраў, накіраваных на патрыятычнае выхаванне моладзі, захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, прапаганду здаровага ладу жыцця. Стварэнне мемарыяльнага комплексу "Урочышча Пяскі" ў г. Полацку, традыцыя правядзення Мінскага паўмарафону, які набірае папулярнасць, — гэта толькі малая частка тых яркіх прыкладаў, якімі можна ганарыцца.

Паважаныя калегі!

Падводзячы вынікі, хачу сардэчна падзякаваць вам за работу. Дэпутаты на справе даказалі сваю кампетэнтнасць, прыстойнасць, высокую адказнасць.

Зроблена нямала, і важна, каб усе добрыя пачынанні былі прадоўжаны новым складам дэпутацкага корпуса. Упэўнены, нашы калегі, якія застануцца працаваць у Палаце прадстаўнікоў, стануць ядром, якое з'яднае новы калектыў.

Дазвольце шчыра пажадаць усім поспехаў у далейшай дзейнасці на карысць роднай Беларусі.

## ■ Парламенцкі дзённік

# Судовых выканаўцаў падначаляць адной структуры

### На апошнім пасяджэнні дзясятай сесіі дэпутаты разгледзелі чатыры законапраекты

**Няхай сама сесія атрымалася вельмі кароткай — усяго чатыры дні — падчас яе парламентарыі паспелі разгледзець і прыняць усяго каля 30 законапраектаў, уключна з галоўнымі фінансавымі дакументамі краіны. Работа атрымалася сапраўды плённай, і дэпутатам наступнага склікання ёсць чаму павучыцца.**

**Уладзімір ЧАРАВАЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве**, прадставіў праекты законаў «Аб судовых выканаўцах» і «Аб выканаўчай вытворчасці», якія разглядаліся ў другім чытанні.

— Прыняцце гэтых дакументаў з'яўляецца адным з завяршальных этапаў рэформы, сутнасць якой у тым, каб аб'яднаць у адну сістэму судовых выканаўцаў эканамічных судоў і судовых выканаўцаў агульных судоў, якія, па сутнасці, займаліся адным і тым жа, але мелі розную ведамасную падначаленасць, — патлумачыў ён журналістам.

**Аляксандр ЦЕРАХАЎ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі**, прадставіў у першым чытанні праект закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь». Кіраўнік ведамства растлумачыў, што сутнасць дакумента — у перайменаванні некаторых тэрмінаў у адпаведнасці са зменены заканадаўствам. Замест камунальнай паслугі «карыстанне ліфтам» прадугледжваецца аказанне жыллёва-камунальнай паслугі «тэхнічнае абслугоўванне ліфта», а тэрмін «вываз, абясшкоджванне і перапрацоўка цвёрдых камунальных адходаў» зменены на «абыходжанне з цвёрдымі камунальнымі адходамі».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# Бюджэт ухвалены

### Адпаведнае рашэнне прынялі сенатары

**Падчас закрыцця дванаццатай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу пятага склікання парламентарыі разгледзелі дваццаць чатыры пытанні. Сярод іх — тыя, што тычацца бюджэту, транспартнай сферы, аховы здароўя, міжнародных адносін.**

Перш за ўсё сенатары разгледзелі шэраг законапраектаў па бюджэце. **Уладзімір АМАРЫН, міністр фінансаў**, прадстаўляючы праект закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2017 год», паведаміў, што выдаткі на фінансаванне аховы здароўя, адукацыі і культуры растуць больш высокімі тэмпамі ў параўнанні з іншымі сферамі. «Выдаткі кансалідаванага бюджэту на ахову здароўя складуць 4,4 мільярда рублёў, — адзначыў ён. — На адукацыю — 5,1 мільярда рублёў, ці 4,7% да ВУП. Выдаткі на сацыяльную палітыку прадугледжваюць дадатковую падтрымку шматдзетных сем'яў і фарміраванне сямейнага капіталу ў суме 458 мільёнаў рублёў. Гэта рост на 15% да ўзроўню бягучага года».

Сенатары ўхвалілі некалькі законапраектаў, звязаных з суднаходствам і яго развіццём, маладзёжнай палітыкай, ветэрынарнай сферай, а таксама ратыфікавалі пагадненні аб узаемнай адмене віз з Макаа, спецыяльным адміністрацыйным раёнам Кітайскай Народнай Рэспублікі, Эстонскай Рэспублікай.

**Вераніка ПУСТАВІТ**
*pustavit@zviazda.by*

## ■ Знешняя палітыка

# Брытанскі прынц прыязджае да нас

**Пра гэта паведаміў на брыфінгу Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў. Візіт члена брытанскай каралеўскай сям'і, стрыечнага брата каралевы Лізаветы ІІ прынца Майкла Кенцкага адбудзецца 10—13 кастрычніка, у Беларусі ён будзе знаходзіцца з рабочым візітам.**



— Прынц Майкл Кенцкі займаецца кансалтынгавай дзейнасцю, бізнесам і дабрачыннасцю ў шэрагу краін свету, — расказаў Дзмітрый Мірончык. — У прыватнасці, пад патранажам Яго Высокасці рэалізуецца шэраг глабальных некамерцыйных ініцыятыў у сферы бяспекі дарожнага руху — Міжнародны дабрачынны фонд «International Road Safety Awards» і некамерцыйная структура «RoadSafe», якія ўзнагароджваюць новыя тэхналогіі будаўніцтва дарожнай інфраструктуры, а таксама бяспекі пешаходаў і вадзіцеляў.

Як паведаміў прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства, у рамках візіту плануецца правядзенне сустрэч з беларускімі афіцыйнымі асобамі, наведванне Парка высокіх тэхналогій, а таксама шэрагу гістарычных і культурных аб'ектаў — мемарыяльнага комплексу Хатынь, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальнага мастацкага музея.

— Візіт члена брытанскай каралеўскай сям'і будзе садзейнічаць развіццю двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, а таксама пашырэнню культурных сувязяў паміж Беларуссю і Вялікабрытаніяй, — заявіў Дзмітрый Мірончык.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ■ Надвор'е

# УНАЧЫ ЎЖО ЗАМАРАЗКІ

### На наступным тыдні сярэднясутачная тэмпература паветра складзе ўсяго 3—7 цяпла

**Сапраўды халоднае і няўстойлівае надвор'е захаваецца ў нашай краіне і ў выхадныя, паведамляе галоўны сіноптык службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

У пятніцу на тэрыторыі Беларусі будуць гаспадарыць атмасферныя франты і халодная паветраная маса, якая паступае з поўначы Еўропы. Удзень на большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература ўдзень будзе дасягаць плюс 7—13 градусаў. І ў выхадныя Беларусь застанецца пад уплывам атмасферных франтоў і паўночнага холаду. У суботу і нядзелю будзе воблачна з праясненнямі, на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер будзе паўночна-ўсходні ўмераны, па паўночным захадзе — парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 2—9 градусаў, а ўдзень чакаецца ад плюс 6 да плюс 13 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, ужо на наступным тыдні атмасферныя франты пакінуць тэрыторыю нашай краіны, але на іх месца прыйдзе халодны скандынаўскі антыцыклон. Дажджоў паступова стане менш, але будзе яшчэ больш халадна, калі тэмпературны фон акажацца нават на 2—4 градусы ніжэй за кліматычную норму. Яшчэ ў панядзелак па паўднёва-заходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 2—7 цяпла, а ўдзень складзе ад плюс 5 да плюс 11 градусаў. Надалей да нас завітае хваля холаду позняй восені. У аўторак і сераду будзе пераважна без ападкаў, толькі ў крайніх паўднёва-заходніх раёнах магчымы невялікія дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах сіноптыкамі прагназуецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—6 цяпла, а ў асобных раёнах магчымы замаразкі да мінус 4 градусаў. Халодна будзе і ўдзень, калі прагназуецца ўсяго 3—10 цяпла. Нагадаю, што пры сярэднясутачнай тэмпературы паветра да плюс 8 градусаў на працягу 5 дзён, у жыллёвы сектар даюць цяпло. Чакаем.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*



# «ПАСТАЯННЫЯ НАВЕДНІКІ КЛІЧУЦЬ МЯНЕ «КАЛІ ЛАСКА»,

## або Як навучыцца размаўляць, калі баішся памыліцца?

*Кожны раз, калі мы, звяздоўцы, бачым, што на вітрыне чарговай крамы з'яўляюцца беларускія слоўцы (або сустракаем усё больш людзей у вышыванках ды часцей чуем родную мову ў грамадскім транспарце), шчыра радуемся і думаем: «Вось гэта па-нашаму!» Прынамсі, з такіх думак і нарадзілася ідэя новай рубрыкі. Хтосьці калекцыянуе рарытэтныя машыны, хтосьці статуэткі...*
*Мы ж вырашылі збіраць цікавыя праекты і ініцыятывы, звязаныя з адраджэннем беларускай мовы і традыцый. Пачнём з сеткі аўтазаправак, дзе ўжо амаль два гады з кліентамі вітаюцца па-беларуску.*

**«Вітаем вас», «Дзякуй», «Прыязджайце да нас яшчэ» — гэтыя тры фразы на роднай мове пачула на адной з аўтазаправак сталіцы. Там жа і пазнаёмілася з Ірынай Валаховіч, якая працуе на АЗС.**

На родную мову перакладзеныя практычна ўсе шыльды і надпісы. Куды ні кінь погляд — усюды радуюць вока беларускія слоўцы: «крама», «скруцень і бульбяное пюрэ», «пыласос», «мыйня»... Каля ўваходу, непадалёк ад білборда з надпісам «Дзякуй за вашу крытыку», выстаўлены некаторыя тавары, у тым ліку і (чытаю на фірмовым цэнніку) «дровы фасаваныя ў мяшкЕ». Фатаграфую гэтую памылку, каб потым абавязкова сказаць пра яе супрацоўнікам запраўкі. Заходжу ўнутр — там беларускіх слоўцаў яшчэ больш (толькі цэннікі на тавары пакуль на рускай мове. Але і іх збіраюцца перакладаць). Стаю ў чарзе, вывучаю надпісы «З намі зручней», «Не марнуй час», «Прывітанне, спяшаешся — падыходзь хутчэй»...

Я, хоць і не вельмі спяшаюся, але падыходжу. «Вітаю вас», — усміхаецца мне аператар Ірына (чытаю на бэйджыку). «Мне, калі ласка, каву», — усміхаюся ў адказ. «Стандартны кубачак ці вялікі?»

...Пакуль я піла сваю каву, Ірына паспела абслужыць чалавек 20.

Вось да касы падыходзіць малады чалавек з вялікімі навушнікамі. Плаціць за паліва. Потым вяртаецца і набывае каву. Цікаўлюся, як ён ставіцца да беларускай мовы на запраўцы?

— Пры зручным выпадку люблю заехаць сюды заправіцца кавай ці палівам, — адказвае па-беларуску (хоць па жыцці карыстаецца пераважна рускай мовай) сістэмны адміністратар і музыка Андрэй Антара. — Вельмі прыемна, калі вітаюцца на роднай мове... Яшчэ тут даволі вясёлыя надпісы на бензакалонках, у прыватнасці «рыльца паліўнага бака». І на кава-апараце (зачытвае): «Скрадзеная кава губляе да 100% смакавых якасцяў, а трапляючы ў арганізм, ператвараецца ў гарбуз». А яшчэ цудоўна было б, каб на радыё тут хоць зрэдчас гучала якасная беларуская музыка.

А вось сямейная пара вырашыла «заправіцца» не толькі палівам, але і хот-догамі. «Вам якую сасіску — курыную ці ялавічную?» — даносіцца да мяне звонкі голас аператара. Муж і жонка пераглядаюцца: «Якую-якую?» Ірына тлумачыць, што ялавічына — гэта «говядина», але па-беларуску. «Можа, кавы яшчэ жадаеце?» Ад кавы муж з жонкай адмовіліся, але ялавічныя сасіскі вырашылі пакаштаваць. Сыходзілі яны з запраўкі з усмешкамі.

«Кошты на ўсіх аўтазапраўках аднолькавыя, але я прынцыпова запраўляюся толькі тут, — кажа малады дызайнер у цішотцы з арнаментам. — Проста тут адчуваю сябе як дома, бо магу без напружання карыстацца роднай мовай. Не баючыся, што хтосьці нагрубіць, скажа: «говорите на нормальном языке» ці «говорите по-русски». Дзякуй богу, такіх выпадкаў усё менш. Бо дзе ж яшчэ мне, беларусу, карыстацца мовай, як не ў Беларусі? За апошні год паболела прадаўцоў, якія, калі ты штосьці пытаешся ў іх па-беларуску, стараюцца адказваць на роднай мове. Я сам да 27 гадоў размаўляў выключна па-руску. Таму разумею, што складана пачаць. Проста мы, беларусы, прывыклі чакаць. Як на дыскатэцы: пакуль хтосьці першы не выйдзе і не пачне танчыць — пляцоўка будзе пустая. Дзе навучыцца танчыць, калі ніколі не спрабаваў? Як навучыцца размаўляць, калі баішся памыліцца? А як вучацца дзеці? Гэтак жа сама. А той, хто са злосцю тыцкае фразамі кшталту «ты на трасянке говоришь», сам наўрад ці пакажа прыклад. Такія людзі мала таго, што самі не размаўляюць, дык яшчэ імкнуцца забараніць іншым, прыдумваючы для гэтага самыя дзіўныя тлумачэнні».

**«Ёсць пастаянныя кліенты, якія хоць і размаўляюць па-руску, але прыхільна ставяцца да роднай мовы».**




Тых, хто п'е тут каву ўпершыню, весяліць вось гэтая налепка на кава-апараце.



Фота Надзеі БУЖАН.

...І вось у Ірыны Валаховіч перапынак. Карыстаючыся момантам, прадстаўляюся і дзякую ёй за мову. Дзяўчына з задавальненнем пагаджаецца адказаць на мае пытанні. Праўда, адразу ж выбачаецца за магчымыя памылкі, маўляў, практыкі мала, па-беларуску размаўляе толькі на працоўным месцы.

***— Адкуль ведаеце мову?***

— Са школы. Мне проста пашанцавала з настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. Працую на АЗС крыху больш як 2 гады. Калі ўладкоўвалася, усё тут было па-руску. А пасля вырашылі зрабіць беларускую мову абавязковай для аператараў. Спачатку, калі шчыра, была паніка. Але што рабіць — пачала ўспамінаць усё, што ведала. Моўныя курсы для нас ладзілі бясплатныя, гэта шмат чаго дало. Праўда, у выніку кіраўніцтва вырашыла пакінуць тры абавязковыя фразы на роднай мове. Але я за тыя паўгода так натрэніравалася, што і цяпер, як толькі станаўлюся за касу, быццам кнопка нейкая ўключаецца — размаўляю з кліентамі толькі па-беларуску. Трымаць сябе ў форме дапамагае старэйшая дачка, яна ходзіць у 6 клас. Вечарамі правяраю, як яна выканала дамашняе заданне па мове ды літаратуры, і сама адначасова вучуся.

***— Бывае, што і ў звычайным жыцці пераходзіце на беларускую мову?***

— Так, калі прыходжу дадому, магу штосьці сказаць па-беларуску. Муж злуецца, бо не разумее. Дзецям падабаецца. Меншая дачка ў садзік ходзіць, дык там нядаўна пачалі вывучаць беларускую мову. Пакуль, праўда, Насця ведае толькі асноўныя фразы «добрай раніцы», «дзякуй», «да пабачэння». Часам у краме магу штосьці спытацца па-беларуску, дык людзі глядзяць на мяне тады вялікімі вачыма.

***— А як кліенты рэагуюць на вашу беларускую?***

— Па-рознаму: нехта пасміхаецца, нехта правакуе... Але пазітыўнай рэакцыі значна больш. У нас стала больш беларускамоўных наведнікаў. Ім, напэўна, вельмі прыемна, што і на запраўках хтосьці ведае беларускую мову. Ёсць пастаянныя кліенты, якія хоць і размаўляюць па-руску, але прыхільна ставяцца да роднай мовы. Могуць прыйсці і сказаць «Дзе гэта наша «калі ласка»?» Многія з іх толькі да мяне становяцца ў чаргу, нават калі іншы аператар свабодны. Некаторыя пытаюцца: «Чаму іншыя на рускай, а вы на беларускай мове абслугоўваеце?» — «Бо я люблю сваю родную мову», — адказваю. Насамрэч і калегі мае стараюцца, проста ў іх не такі голас звонкі, як у мяне *(смяецца)*. Калі стажоры прыходзяць, яны побач са мной становяцца і чуюць, як я размаўляю. І таксама пачынаюць: і «рубель», і «дзякуй», і «ваша рэшта».



Ірына ВАЛАХОВІЧ з кіроўцамі размаўляе толькі па-беларуску.

Такога, каб «не размаўляйце са мной па-беларуску. Я не хачу» — не было. Проста ёсць кліенты, якія не разумеюць — вы ж самі чулі — тады пераходжу на рускую. Многія, напрыклад, не ведаюць, што такое ялавічына. А тыя, хто ведае, націск няправільна ставяць. Я пачынаю выпраўляць: правільна не ялавІчныя, а Ялавічныя. «А адкуль вы ведаеце, вы ж не настаўніца?» — «Таму што на моўных курсах выкладчыца сказала, што ў беларускай мове ёсць толькі слова Ялавічныя». Наступным разам прыходзяць і кажуць ужо правільна *(усміхаецца)*.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

*nadzieja@zviazda.by*

*— Ці заахвочваеце вы неяк беларускамоўных супрацоўнікаў, каб у астатніх быў стымул удасканальваць родную мову?* — пацікавіліся мы ў **кіраўніка кампаніі.**

— Сказаць, што мы асобны заробак плацім аператарам, якія размаўляюць па-беларуску, дык не. Бо ў нашай краіне дзве дзяржаўныя мовы. Разам з тым жыццё — справядлівая штука. У межах праграмы ўдзячнасці мы ладзім асобныя ўнутраныя розыгрышы прызоў сярод супрацоўнікаў. На днях разыгрываўся вялікі тэлевізар. І што вы думаеце, з 579 паперак я выцягнула прозвішча менавіта тага аператара, які цудоўна размаўляе па-беларуску. У Ірыны Валаховіч вельмі шмат падзячных запісаў, яна рэальна заслужыла той тэлевізар.

*— Чаму вырашылі абмежавацца толькі трыма абавязковымі фразамі на роднай мове?*

— Стандартныя фразы «Вітаем вас», «Дзякуй» — гэта дастаткова лёгка. А калі кліент задаваў нейкія спецыфічныя пытанні, напрыклад, пра аліву для аднатактнага рухавіка (ці ёсць яна і для чаго падыходзіць?), зразумела, супрацоўнікам было вельмі цяжка. Яны ўпадалі ў ступар. І часам аддавалі перавагу маўчанню. У выніку мы змянілі падыход. Сышлі ад абавязалаўкі. Рэкамендуем аператарам абслугоўваць кліентаў па-беларуску, але не прымушаем. Пакінулі толькі тры фразы на беларускай мове: «Вітаем вас», «Дзякуй», «Прыязджайце да нас яшчэ». Яны з'яўляюцца абавязковымі і ўваходзяць у стандарт абслугоўвання. Плюс мы пакінулі беларускую мову ва ўсіх візуальных камунікацыях. Такім чынам пакрысе прывучаем людзей. Спадзяюся, што кліенты будуць з задавальненнем вучыцца беларускай мове, хоць бы вось гэткім аспрацаваным чынам. І вельмі хочам развіваць гэту ініцыятыву далей. У прыватнасці, цяпер працуем над новым праектам уніформы з беларускай сямейнай парай, якая стварыла брэнд Honar і шые вельмі якаснае стыльнае адзенне з нацыянальнымі матывамі на кожны дзень. Не сакрэт, што самы буйны гулец на рынку спецадзення — фіны — у іх кошты больш цікавыя. Можна было звярнуцца да іх, але мне, напрыклад, важна, каб мы падтрымалі менавіта свае ініцыятыўных людзей. Таму што тэма беларускасці — гэта не толькі мова. Гэта ў цэлым павага да краіны, у якой ты жывеш.

*— Ці шмат у кампаніі аператараў, якія абслугоўваюць кліентаў цалкам на беларускай мове?*

— Каля 15—18%. Што цікава, найбольш такіх на брэсцкіх запраўках. Я атрымліваю неймавернае задавальненне, калі з імі кантактую. Вядома, хацелася б, каб аператараў, якія маглі б падтрымаць размову на роднай мове, было больш. Але, самі разумееце, усё не так проста. Пераважная большасць зносін у краіне ідзе на рускай мове. І я зараз з вамі гавару па-руску, бо пакуль яшчэ, на жаль, мала людзей у нас добра валодаюць роднай мовай.

*— На свае вочы пераканалася, што практычна ўсе шыльды і надпісы на запраўках перакладзеныя на мову. Але ж інструкцыя на мыйні рускамоўная...*

— З гэтым таксама не ўсё проста. Калі чытаеш, напрыклад, тэхнічную інструкцыю па эксплуатацыі мыйні на беларускай мове — вельмі складана ўсё зразумець, нават калі ты вывучаў мову ў школе. Таму мы яе скарацілі, пакінулі толькі базавыя рэчы па-беларуску — уключыць, выключыць, запусціць. Пашыраная ж інструкцыя, сапраўды, вісіць на рускай мове.

Можна, вядома, сказаць: «Гэта вашы праблемы, што не разумееце». Але я не лічу, што гэта правільна. Пакуль асноўная маса людзей размаўляе па-руску, мы павінны з гэтым лічыцца, паважаць выбар кожнага. Але пры гэтым не забывацца, што беларуская мова — наша родная.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# ГЕРОІ, У ЯКІХ НЕЛЬГА НЕ ЎЛЮБІЦЦА

## Як брэсцкая тэлежурналістка казу даіла, Кустом хадзіла, вясельныя вяночкі пляла




**З 1 кастрычніка ў эфіры тэлеканала «Беларусь 3» з'явіўся новы штотыднёвы этнаграфічна-краязнаўчы праект «Край». Рэдактар аддзела спецпраектаў тэлерадыёкампаніі «Брэст» Таццяна БОЛТУЦЬ працуе над цыклам перадач па гісторыка-культурнай спадчыне для названага праекта. Маладая журналістка мае намер пазнаёміць гледача з творчымі асобамі, народнымі майстрамі, носьбітамі абрадаў і традыцый свайго і суседніх рэгіёнаў, а таксама значнымі культурнымі падзеямі. Абяцае шмат цікавага. Наогул, Таццяна лічыць, што менавіта ў гэтым праекце знайшла сябе:**

— Даведалася, што буду займацца гэтай работай, дзесьці ў сярэдзіне лета. Час прайшоў на адным дыханні, здаецца, як села за камп'ютар тады, а цяпер вось устала, паглядзела ў акно: восень глыбокая, хутка снег пойдзе. І яшчэ, даволі сабе падзяліцца адным назіраннем. Некалькі разоў выязджалі на здымкі, і літаральна на вачах псавалася надвор'е, пачынаўся дождж. Разумееце, настрой у такіх выпадках робіцца, што хоць ты садзіся і плач. Але як толькі прыязджаем на месца, не толькі распагоджваецца, праз колькі часу сонейка выглядае. І атрымліваем магчымасць як трэба адзняць матэрыял. Ці не цуд? І ні разу не было інакш! Так што міжволі падумаеш, што богаўгодную справу робім. Таму хочацца ездзіць, знаходзіць сваіх герояў у самай аддаленай глыбінцы, расказваць пра іх усёй краіне.

### Даведка «Звязды»

*Мэта праекта «Край» — пазнаёміць тэлегледачоў з яркімі прадстаўнікамі самых розных відаў народнага мастацтва, спрадвечнай беларускай культуры, сярод якіх — мастакі, акцёры, майстры, якія ствараюць унікальныя вырабы сваімі рукамі, паэты, самадзейныя музычныя калектывы і г. д. Кожны выпуск праграмы «Край» дэманструе пэўныя цікавінкі: выставы твораў саломапляцення і чорнаглянцаванай керамікі, узоры ткацтва ручнікоў, кулінарныя экспедыцыі, а таксама ўнікальныя беларускія абрады!*

*Як расказалі ў прэс-службе Белтэлерадыёкампаніі, праект «Край» для культуралагічнага тэлеканала ствараюць творчыя групы ўсіх абласных тэлерадыёкампаній — кожная пра свой рэгіён. А распачалі гэты цыкл выпускі праграм, падрыхтаваныя карэспандэнтамі тэлерадыёкампаніі «Брэст».*

«Нашы перадачы, — зазначае Таццяна Болтуць, — умоўна дзеляцца на чатыры рубрыкі. Першы раздзел складае падборка пад назвай **«Асобы»**: гэта людзі, найчасцей вяскоўцы, якія праявілі сябе ў нейкай творчай справе альбо як захавальнікі абрадаў і традыцый. Напрыклад, не так даўно я рабіла перадачу пра Генрыха Міхайлавіча Трацяка, які купіў былую панскую сядзібу ў Флер'янове Ляхавіцкага раёна і адраджае яе фактычна ў адзіночку. 80-гадовы чалавек, былы старшыня калгаса, траціць значную частку сваёй пенсіі, прыцягвае аднадумцаў, заразіў ідэяй жонку, дзяцей блізкіх сяброў. І ў яго многае атрымліваецца!» («Звязда», дарэчы, таксама расказвала пра Генрыха Міхайлавіча ў нумары за 27 кастрычніка 2015 года. — **Аўт.**)

— Я, можна сказаць, улюбілася ў апантанасць чалавека сваёй справай — расказвае Таццяна. — Далёка не ўсё ўвайшло ў перадачу, але да гэтай пары помніцца многія дэталі, што здольныя выклікаць замілаванне. Напрыклад, Генрых Міхайлавіч расказваў, як да яго аднойчы зайшоў хлопчык, малодшы школьнік, і спытаў: «Дзед Генрых, чаму дзверы тут не пафарбаваныя?» На што дзед яму, як дарасламу, адказаў, што значная справа не робіцца хутка, як нам хочацца, бо на ўсё грошы патрэбныя. Тады малы, падумаўшы, заўважыў: «Ты не хвалюйся, дзед. Я вырасту, сам куплю фарбу, сам і пафарбую». ...Асабліва ўсяляе надзею той факт, што герой перадачы дзейнічае не сам па сабе, ён праводзіць у вёсцы ў тым ліку асветніцкую работу з дзецьмі, вучыць іх шанаваць сваю спадчыну, заўважаць прыгажосць. І яшчэ, ён шмат гадоў быў на кіруючай пасадзе, можна сказаць, у гушчыні жыцця. Цяпер таксама мае магчымасць адчуваць сябе патрэбным, быць чалавекам справы. У яго сітуацыі неабходна пэўная смеласць, каб не звяртаць увагі на выпады нядобразычліўцаў, пераадольваць шматлікія цяжкасці. Адным словам, справа яго натхняе ды служыць прыкладам іншым.

**3.30** «Дурні і дарогі».
**4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**5.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Запомніце мяне такой». Маст. фільм.
**12.50** «Ангеліна Сціпанава. Сёння — мой дзень». Дак. фільм.
**13.30** Пернікавы домік. «Не толькі пэндзлем».
**14.00** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**14.30** «Любо, братцы, любо...» Канцэрт Кубанскага казацкага хору.
**15.30** «Гадзіннік і гады». Дак. фільм.
**16.15** «Гульня ў бісер». «Юрый Алеша. «Тры таўстуны».
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** Мікалай Бурляеў чытае вершы Лермантава.
**17.45** «Рамантыка рамансa». Аскару Фельцману прысвячаецца...
**18.50** «Больш чым каханне». Нона Мардзюкова і Вячаслаў Ціханаў.
**19.30** «Простая гісторыя». Маст. фільм.
**21.00** Вялікая опера-2016.
**23.00** «Белая студыя».
**23.40** Кіно на ўсе часы. «Каралеўскі раман». Маст. фільм.
**1.55** «Шукальнікі». «Сакрэтныя агенты фабрыкі «Зінгер».
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**7.05** «Марат, Ліка і Леанідзік». Спектакль Маскоўскага тэатра «Ленкам». 1971 год.
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**9.40, 11.00, 13.35, 14.35, 15.40, 19.05, 20.35, 21.40, 23.30, 2.35, 3.40** Музычная настальгія.
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** Маст. фільм «Рэспубліка ШКІД».
**14.25** «Рок-н-рол ТБ». 1993 год.
**16.00** «Колба часу». 1993 год.
**17.00** «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Усерасійскі рэферэндум аб даверы Б.М. Ельцыну». 1993 год.
**18.00** Тэлеспектакль «Гадзіннік з зязюляй». 1978 год.
**19.20** «Зямля—Паветра». «Смысловые галлюцинации». 2003 год.
**21.00** «Быў час». 2008 год.
**22.00** Маст. фільм «Школьны вальс».
**0.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год.
**1.15** Маст. фільм «Ксенія, любімая жонка Фёдара».
**5.00** «Песня-79». 2-е аддзяленне.

### EuroSport 1

**4.00, 6.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод дзяўчат (U-17).
**5.00, 8.00, 12.15, 15.00, 19.30, 21.00, 2.30** Снукер. English Open.
**9.30, 0.05** Тэніс. Турнір WTA.
**11.00** Ралі. За кулісамі ERC.
**11.30, 14.00, 18.00** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.

### Кінакамедыя

**0.35** Камедыя «Спецагенты на адпачынку».
**2.20** Меладрама «10 дзён каб закахацца».
**4.00, 15.45** Скетчкам «Паміж намі».
**5.10** Камедыя «Дзеці сексу не перашкода».
**7.05** Камедыя «Я вяртаюся да мамы».
**8.45** Камедыя «Муж дзвюх жонак».
**10.25** Камедыя «Востраў скарбаў».
**12.10** Меладрама «Каханне і лімоны».
**14.00** Камедыя «Школа злодзеяў».
**16.00** Камедыя «Праект «А».
**17.45** Камедыя «Праект «А». Частка другая».
**19.35** Камедыя «Ультраамерыканцы».
**21.20** Камедыя «Кекс у вялікім горадзе».
**23.00** Меладрама «Сама па сабе».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.00, 4.00** «Хронікі маскоўскага побыту».
**10.55** «Доказ віны».
**11.30, 0.55** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**15.05** «Монстр у Парыжы». Анімацыйны фільм.
**16.30** «Зоркі. Тайны. Лёсы».
**17.35** «Алігарх ТБ».
**18.05** «Вакол свету. Мясціны сілы».
**19.05** «Прывід на дваіх». Меладрама.
**21.00** «Някіруемы». Трылер.
**22.55** «Каліфрэнія». Серыял.
**23.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.40** «Ганенне адзін супраць усіх». Дак фільм.

### ТБ1000

**6.10, 14.10** Камедыя «Хацеў бы я быць тут».
**8.10** Трылер «Анёлы і дэманы».
**10.35** Драма «Манглхорн».
**12.20** Меладрама «У чаканні вечнасці».
**16.10** Драма «Настаўнік на замену».
**18.10** Меладрама «Ціхая гавань».
**20.10** Фантастыка «Пачатак».



**23.05** Драма «Кінутая на волю лёсу».
**0.55** Камедыя «Сенсацыя».
**2.30** Камедыя «Прывіды былых сяброваk».
**4.10** Драма «Жнівень».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Трагікамедыя «Апошні забой».
**8.20** Трагікамедыя «Чалавек ля акна».
**10.20** Камедыя «Любовь-морковь»-2.
**12.20** Камедыя «Падкідыш».
**13.40** Камедыя «Утаймавальнікі веласіпедаў».
**15.10** Драма «Сава Марозаў».
**17.00** Камедыя «Развод па ўласным жаданні».
**18.35** Трылер «Перакладчык».
**20.20** Камедыя «Слухач».
**22.10** Трылер «Уцёкі».
**0.20** Драма «Смяцяр».
**2.10** Камедыя «Прыкідваючыся ахвярай».
**4.25** Камедыя «Атамны Іван».

### National Geographic

**6.00, 12.40** Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога.
**6.50** Як перамагчы ва ўсім.
**7.10, 13.30, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Незвычайныя промыслы.
**10.20** Дзікі тунец.
**11.10** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**11.55** Расследаванні авіякатастроф.
**14.10** Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.
**21.00, 0.50, 4.00** Тайны старажытнасці.
**22.30, 2.25** Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
**23.20, 3.10** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00** Загадкі планеты Зямля.
**9.00** Стальныя хлопцы.
**10.00** Металаломшчыкі.
**11.00, 23.00** Востраў.
**12.00** Выжыць разам.
**13.00, 1.00** Голыя і напалоханыя.
**14.00, 22.00** Аляска: сям'я з лесу.
**15.00** Заваёўванне новых земляў.
**16.00, 21.00** Як працуюць машыны.
**17.00** Будаўнікі караблёў-гігантаў.
**18.00, 7.10** Махінатары.
**19.00, 0.00** Мяцежны гараж.
**20.00** Вулічныя гонкі.
**2.00** Дзікая кухня.
**4.40** У пагоні за класікай.

## Zамор'е

### СУПЕРКАР ДЛЯ ДЗІЦЯЦІ

**Брытанскі вытворца аўтамабіляў McLaren стварыў паменшаную копію родстара P1. Машына працуе на батарэйках і прызначана для дзяцей да сямі гадоў, паведамляе Highsnobiety.**



У аўтамабілі прадугледжаны тры хуткасці, разгон займае 2 секунды. Акрамя таго, мініяцюрны родстар абсталяваны MP3-плэерам і музычнай сістэмай з запраграмаванымі дзіцячымі песнямі. У продаж ён паступіць у канцы кастрычніка, цана — 485 долараў. Арыгінальны McLaren P1 — англійскі суперкар з гібрыдным рухавіком, цяпер яго кошт складае каля $900 тыс. У лютым 2016 года кампанія Radio Flyer стварыла таксама паменшаную копію вядомага электрамабіля Tesla Model S.

### А ДЗЕ ПЯРСЦЁНАК?

**У ЗША жаданне мужчыны прапанаваць каханай руку і сэрца абярнулася канфузам.**

Інцыдэнт адбыўся падчас бейсбольнага матча на адным з стадыёнаў Нью-Ёрка. Фанат каманды New York Yankees вырашыў зрабіць прапанову сваёй дзяўчыне, але ў самы адказны момант здарылася няўдача — пярсцёнак выскачыў са скрыначкі і пакаціўся. Гэты момант трапіў на відэа. На пошукі каштоўнасці кінуліся ўсе балельшчыкі, якія былі побач. На шчасце, праз літаральна пару хвілін пярсцёнак быў знойдзены, пасля чаго мужчына паўтарыў сваё пытанне, а яго любая адказала згодай пад аглушальныя авацыі стадыёна.

### МОЦНА РАЗУМНАЯ ТЭХНІКА

**Разумны халадзільнік у краме электронікі Home Depot самастойна зайшоў у інэрнэце на сайт для дарослых. Фота з адкрытай старонкай на яго сэнсарнай панэлі з сваім Twitter апублікаваў эксперт па бяспецы і кіраўнік кампаніі McAfee Джон Макафі.**



«Інтэрнэт рэчаў»... Вы мне верыце? Сайт для дарослых у халадзільніку. Ну і якія цяпер ідэі па забеспячэнні інфармацыйнай бяспекі?» — пытаецца Макафі. Фотаздымак хутка стаў хітом на партале Reddit. У каментарыях карыстальнікі адзначылі, што глядзець падобнае відэа на халадзільніку нязручна, і набываць разумную прыладу для гэтых мэт не мае сэнсу.

У жніўні спецыялісты па бяспецы з брытанскай кампаніі Pen Test Partners Эндру Цірні і Кен Манро стварылі вірус-вымагальнік, здольны ўзломваць разумныя тэрмастаты. Прылада пачынала мяняць тэмпературу ў памяшканні ад мінімальнай да максімальнай, а затым выводзіла на дысплеі патрабаванне пералічыць грошы на рахунак узломшчыкаў.

### «ДАРАГАЯ, ТЫ ХУТКА?»

**А дарагая збіраецца не проста хутка, а імгненна! Фокуснік разам з асістэнткай патрапілі ў Кнігу рэкордаў Гінеса пасля таго, як выканалі самую вялікую ў свеце колькасць пераапрананняў у адну хвіліну.**

Відэазапіс дасягнення, зробленага падчас шоу ў забаўляльным парку кітайскай правінцыі Хубэй, апублікавалі на YouTube-канале Guinness World Records. Як гаворыцца ў подпісе да відэа, выхадцам з Малайзіі ўдалося змяніць 19 розных касцюмаў. Такім чынам, яны пабілі папярэдні рэкорд, калі ўборы змянялі 17 разоў.

**Іван КУПАРВАС**

■ О, жанчыны!

## На дарогах — лужыны, у лужынах — мадэлі

**У тайскай правінцыі Так мадэль выкупалася ў лужыне, каб прыцягнуць увагу ўладаў краіны да дрэнных дарог у рэгіёне, паведамляе BBC News.**



Манекеншчыца па імені Палм жыве ў Бангкоку, аднак рэгулярна наведвае сваякоў у правінцыі. Дзяўчына, якой кожны раз даводзілася пераадольваць шлях па старых пашкоджаных дарогах, выступіла з акцыяй пратэсту, завярнуўшыся ў ручнік і выкупаўшыся ў лужыне. Такім чынам мадэль спадзявалася заклікаць улады да рамонту шляху ў раёне Мае Рамат. Іншыя жыхаркі Тайланда таксама прынялі ўдзел у акцыі пратэсту, але ў сваіх рэгіёнах. Напрыклад, пажылыя жанчыны Кхонкэнскай правінцыі паўтарылі ўчынак Палм. Паводле інфармацыі BBC, улады не займаліся рамонтам сельскіх дарог у краіне больш за 30 гадоў.

У жніўні стала вядома, што каля 900 жыхароў паўднёвакарэйскага павета Санджу пагаліліся нагала падчас акцыі пратэсту супраць размяшчэння амерыканскага комплексу супрацьракетнай абароны THAAD.

## Брытанкі мяняюць абцасы на красоўкі

**Мода на высокія абцасы ў Вялікабрытаніі паступова сходзіць, паведамляе выданне Metro са спасылкай на даследаванне кампаніі Mintel.**



Паводле звестак аналітыкаў, за мінулы год 37% брытанак, якія ўдзельнічалі ў апытанні, купілі красоўкі замест туфляў. «Красоўкі ўпершыню абагналі па продажах абутак на высокім абцасе», — пракаментавала старэйшы аналітык моды ў Mintel Тамара Сэндэр. На пытанне аб перавагах у штодзённым абутку 59% апытаных жанчын адказалі, што ходзяць у абутку на плоскай падэшве. Пры гэтым толькі 12% рэспандэнтак кожны дзень выходзяць на вуліцу на абцасах.

## Здрадзіў — плаці!

**Жыхарка Тульскай вобласці падала судовы іск на мужа, які здрадзіў ёй, і запатрабавала 500 тысяч рублёў у якасці кампенсацыі маральнай шкоды, піша Legal.Report.**

Заяву жанчыны, імя якой не паведамляецца, разгледзіць Суворайскі раённы суд. Расіянка паказала, што муж прызнаўся ёй у доўгай пазашлюбнай сувязі, у выніку якой у яго нарадзілася дзіця ад іншай жанчыны. Пасля гэтага мужчына расстаўся з жонкай. Як паведаміла дама, яна перанесла фізічныя і маральныя пакуты пасля таго, як даведалася пра здраду. Жанчына заявіла, што пасля гэтага ў яе пачаліся болі ў вобласці сэрца, галавакружэнне, бяссонніца. Таксама яна не можа пазбавіцца ад пачуцця трывогі і страху. У якасці доказу расіянка прадставіла дакументы з бальніцы, якія пацвердзілі яе хваробу на працягу трох месяцаў пасля сыходу мужа.

## Нядзеля, 16 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.50, 22.10 Серыял «Дылетант».**
8.30 Народная раніца.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
**9.45 Серыял «Сваты-6».**
11.00 «50 рэцэптаў першага».
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Меладрама «Мама выходзіць замуж».**
14.25 Каробка перадач.
15.15 Твой горад.
15.30 Вакол планеты.
16.15 Зона Х. Вынікі тыдня.
16.45 Тайны следства.
**17.15 Меладрама «Тата для Сафіі».**
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.

### Беларусь 2

**7.05 Серыял «Класная школа».**
7.30, 21.10 Тэлебарометр.
7.35 «Вялікая ілюзія на Кіпры».
8.10 Элементарыум.
8.50 Кулінарны эксперымент.
9.25 «Здзіві мяне 3». Талент-шоу.
11.10 Хачу ў тэлевізар!
11.20 Ваша лато, Пяцёрачка.
**11.50 Серыял «Шчаслівыя разам 3».**
13.40 «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
14.50 «Моду народу».
**15.45 Анімацыйны фільм «Артур і мініпуты».**
**17.35 Баявік «Місія невыканальная: пратакол Фантом».**
20.00 Нас не падманеш!
20.35 Два рублі.
**21.45, 22.10 Серыял «Косці».**
22.05 Спортлато 5 з 36, КЕНО.

### Беларусь 3

8.00, 12.45, 17.20, 21.00 Навіны культуры. «Калейдаскоп».
8.15, 13.00 «Размаўляем пабеларуску». Тэлевіктарына.
**8.20, 17.40 «Дайце кнігу скаргаў». Камедыя.**
9.50 «Наперад у мінулае».
10.15 «Нацыянальны хіт-парад».
11.10 «Музеі Беларусі». Спецыяльны турысцка-рэкрэацыйны парк «Аўгустоўскі канал». Частка 2-я.
11.35 «Заапаркі свету» з Іванам Карнеевым.
12.05 «Цвярдыні свету». Дак. фільм «Гарады Суздаль і Уладзімір. Супернікі».
13.05 «Мелодыі лета». «Мелодыі ад «А» да «Я».
**14.00 «Аса». Драма.**
16.30 «Майстры і куміры». Народная артыстка БССР Наталля Гайда.
**19.05 «Шэрлак Холмс і здарэнне ля вадаспада Вікторыя». Драма.**
20.40 «Калыханка».
21.20 Леанід Дзербянёў. «Паміж мінулым і будучым». Канцэрт з удзелам Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.
22.30 «Час кіно».
**22.35 «Мужчыны». Камедыя.**

### Беларусь 5

7.55, 21.10 Пра спорт. Навіны.
8.05 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Юнацтва-Мінск».
10.00 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — «Дынама» (Брэст).
11.55 Піт-стоп.
12.25 Слэм-данк.
12.55 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
13.25 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Заграб» (Харватыя) — БГК імя Мяшкова (Беларусь).
14.55 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Аўтадар».
16.55 Гандбол. Кубак ЕГФ. Другі кваліфікацыйны раўнд. СКА-Мінск (Беларусь) — «Хард» (Аўстрыя).
18.40 Хакей для ўсіх.
19.10 Хакей. КХЛ. «Поўначсталь» (Чарапавец) — «Дынама» (Мінск).
21.20 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Аўтадар».
23.05 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 2-гі тур. «Барусія» (Дортмунд, Германія) — «Рэал» (Іспанія).

### АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00 (з субцітрамі), 9.00, 16.00 (з субцітрамі) Нашы навіны.
9.05 «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.45 «Фазэнда».
11.15 «Адкрыццё Кітая».
11.45 25 гадоў хору Турэцкага. Юбілейны канцэрт.
**13.30 Маст. фільм «Метро».**
16.15 Навіны спорту (з субцітрамі).
16.20 «Ігар Старыгін. Пяць навел пра каханне».
17.20 «Кропля ў кроплю». Новы сезон.
20.00 Контуры.
21.05 «Ледніковы перыяд».
23.30 «Што? Дзе? Калі?» Восеньская серыя гульняў.
**0.40 Маст. фільм «Зніклая імперыя».**

### СТБ

**6.00 «Неудачников.net». Серыял.**
7.40 «Скардзіцца дазваляецца».
8.00, 16.50 «Аўтапанарама».
8.30 «Нам і не снілася».
11.00 «Вялікае снеданне».
**11.40 «Дэмбельскі альбом». Серыял.**
13.30, 16.30 «24 гадзіны».
**13.45, 1.55 Маст. фільм «Белы Бім Чорнае вуха». 2-я серыя.**
15.25 «Вадзіць па-руску».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
17.20 «Ваенная тайна».
19.30 «Тыдзень».
20.25 «Нашчадкі белых багоў». Дакументальны спецпраект.
**22.15 Драма «Трэнер Картэр».**
0.35 «Соль» Музычнае шоу.

### МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.15 «Даведнік».
6.30, 9.00 М/ф.
8.00 «Культ/Турызм».
8.30 «Беларусь сёння».
9.30 «Няма праблем».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
**10.15 Серыял «Пончык Люся».**
14.20 «Ведаем рускую».
15.00 «Трымайся, шоўбіз!»
15.30 «Чаму я?»
**16.15, 22.00 Серыял «Апярэджваючы стрэл».**
21.00 «Разам».
**1.15 Серыял «На шляху да сэрца».**

### РТР—Беларусь

7.00 «Ха! Маленькія камедыі».
**7.20 Маст. фільм «Расплата за шчасце».**
11.00, 14.00 Весткі.
11.20 «Сам сабе рэжысёр».
12.10 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
12.45 «Ранішняя пошта».
13.20 «Пакой смеху».
14.20 «Смяяцца дазваляецца».
**16.20 Маст. фільм «Асколкі крыштальнага туфліка».**
**18.10, 22.30 Маст. фільм «Правінцыялка».**
20.00 Весткі тыдня.
21.30 Ток-шоу «Што адбываецца».
0.05 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
**6.05, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.50 «Стрынгеры НТБ».
9.25 Ядзім дома.
10.25 «Першая перадача».
11.05 «Цуд тэхнікі».
12.00 «Дачны адказ».
13.05 «НашСпажыўНагляд».
**14.10 Серыял «Следапыт».**
16.25 «Сакрэт на мільён». Дзмітрый Малікаў.
18.05 «Следства вялі...»
19.00 «Акцэнты тыдня».
19.55 «Кіно-шоу».
22.25 «Міжнародная піларама».
23.10 «Таямнічая Расія».

### 8 канал

9.00, 15.20, 19.00, 21.05, 23.20 «Надвор'е».
9.05 «Мультпарад». «Вяртанне Джафара».
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30 «Мой любімы гадаванец».
**11.00, 15.25, 19.05, 21.00 «Хатняя крама».**
**11.15 Серыял «Камісар Рэкс».**
**12.00 Трылер «Начны ўцякач».**
**13.50 Трылер «Сляпы».**
**15.35 Глядзім ўсёй сям'ёй. Маст. фільм «Том Соер».**
**17.20 Серыял «Чыста англійскае забойства».**
**19.15 Драма «Чыстае мастацтва».**
20.50 «Вечарніца».
**21.10 Меладрама «Блакітны бераг».**

### ВТБ

6.00, 4.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
6.30 «Новае жыццё».
7.30, 16.10 «Ералаш».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.15 М/ф «Маша і мядзведзь».
8.30 М/ф «Гадкае качаня і я».
9.00 «Мой тата круцейшы!»
10.00, 0.50 «Турбаміксер».
12.00 «Пасьпець за 24 гадзіны».
13.00 Серыял «Два бацькі, два сыны 2».
15.00, 19.30 «Уральскія пельмені».
15.20 Баявік «Салдат Джэйн».
17.50 М/ф «Баранчык Шон».
21.00 Меладрама «Нявеста, якая ўцякла».
23.35, 4.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
0.00 Еўрапейскі покерны тур-нір.
3.30 «Лаві момант».
5.30 «Дурні і дарогі».

### Культура

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт».
10.35 «Простая гісторыя». Маст. фільм.
12.05 Легенды кіно. Юры Ярвет.
12.35, 0.40 «Жывая Арктыка. Паўночны Ледавіты акіян. Царства холаду». Дак. фільм.
13.30 Геніі і ліхадзеі. Фрыц Габер.
14.00 «Культпаход у тэатр». Маст. фільм.
15.25 «Тыя, з якімі я...» Валерый Рубінчык.
16.25 Да 95-годдзя з дня нараджэння Іва Мантана. Канцэрт у «Алімпіі». Запіс 1981 года.
18.00 «Больш чым каханне». Іў Мантан і Сімона Сіньёрэ.
18.45 «Шукальнікі». «Сакрэтныя агенты фабрыкі «Зінгер».
19.35 XXV Цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў Першай тэатральнай прэміі «Крыштальная Турандот».
20.50 «Бібліятэка прыгод».
21.05 «Золата інкаў, якое знікла». Маст. фільм.
22.15 «Блізкае акружэнне Юрыя Паграбнічка».
23.10 «О, Федэрыка!» Спектакль тэатра «Каля дома Станіслаўскага».
1.35 «Беззаконне». «Пісьмо». М/ф для дарослых.
2.00 — Прафілактыка на канале.

### Настальгія

6.00 Маст. фільм «Рэспубліка ШКІД».
7.35, 9.40, 13.00, 14.35, 17.30, 20.35, 21.10, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
8.25 «Рок-н-рол ТБ». 1993 год.
9.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00 «Колба часу». «1993 год».
11.00 «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Усерасійскі рэферэндум аб даверы Б.М. Ельцыну». 1993 год.
12.00 Тэлеспектакль «Гадзіннік з зязюляй». 1978 год.
13.20 «Зямля—Паветра». «Смысловые галлюцинации». 2003 год.
15.00 «Быў час». 2008 год.
16.00 Маст. фільм «Школьны вальс».
18.00 Маст. фільм «Кахаць чалавека».
20.50 «Час пік» з Андрэем Разбашам. 1997 год.
21.20 «Дванаццатая ноч». Спектакль тэатра «Сучаснік». 1978 год.
0.00 «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзіброцым. 2008 год.
1.05 «Марат, Ліка і Леанідзік». Спектакль Маскоўскага тэатра «Ленкам». 1971 год.
4.00 «Народжаныя ў СССР».

### EuroSport 1

4.00, 6.30 Тэніс. Турнір WTA.
5.00, 8.00 Снукер. English Open.
9.30 Аўтаспорт. Этап чэмпіянату свету па гонках на вынослівасць.
11.15, 13.00 Watts.
11.30, 13.15, 18.00 Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
12.15 Суперспорт. Чэмпіянат свету.
15.00, 18.45 Тэніс. Турнір WTA. Фінал.
17.00, 20.00 Снукер. English Open. Фінал.
0.30 Футбол. Чэмпіянат MLS.

### Кінакамедыя

0.45 Камедыя «Самае горшае Раство ў маім жыцці».
2.25 Меладрама «Я ніколі не буду тваёй».
4.15, 15.45 Скетчкам «Паміж намі».
5.25 Меладрама «Любоўны пераплёт».
7.05 Меладрама «Закусачная на колах».
9.00 Камедыя «К-9: калядныя прыгоды».
10.40 Камедыя «Няўдачлівыя».
12.15 Меладрама «Прагулка па сонечнаму святлу».
14.00 Камедыя «Школа злодзеяў 2».
16.00 Камедыя «Шалёныя грошы».
17.45 Камедыя «План «Б».
19.30 Меладрама «Паспехаў, Чак».
21.15 Камедыя «Уніз па лесвіцы».
23.00 Меладрама «Даю год».
23.45 «Асцярожна, махляры!»
0.15 «Каліфрэнія». Серыял.
0.45 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
5.30 «Доказ віны».

### ТБ3

6.00 М/ф.
9.45 «Паненка і кулінар».
10.20 «Далёка і яшчэ далей».
11.20, 2.10 «Тайны следства». Серыял.
15.00 «Жонка. Гісторыя кахання».
16.25 «Рэвізора».
20.25 «Без падману».
21.20 «Прэстыж». Фантастыка.

### TV1000 ТБ1000

6.10, 18.00 Фільм жахаў «Імгла».
8.15 Драма «Кінутая на волю лёсу».
10.00 Камедыя «Сенсацыя».
11.40 Фантастыка «Пачатак».
14.10 Драма «Жнівень».
16.15 Камедыя «Прывіды былых сябровак».
20.10 Меладрама «Дом каля возера».



22.00 Драма «Саліст».
0.05 Трылер «Айчым».
1.50 Фэнтэзі «Уладар пярсцёнкаў 2: дзве крэпасці».
4.45 Трылер «11:14».

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Камедыя «Слухач».
8.20 Трылер «Уцёкі».
10.35 Драма «Смяцяр».
12.35 Меладрама «Вернасць».
14.20 Трылер «Перакладчык».
16.20 Камедыя «Атамны Іван».
18.20 Прыгоды «Яраслаў. Тысяча гадоў таму».
20.20 Драма «Духless 2».
22.30 Камедыя «Жанчыны супраць мужчын».
0.20 Трылер «Якая бяжыць па хвалях».
2.40 Меладрама «Прасвятленне».
4.25 Прыгоды «Скарбы В.К.»

### National Geographic

6.00 Сапраўдны геній.
6.50 Як перамагчы ва ўсім.
7.10, 13.30, 5.30 Навуковыя недарэчнасці.
8.00 Незвычайныя промыслы.
10.20 Дзікі тунец.
11.10 Міжнародны аэрапорт Дубай.
11.55, 21.00, 0.50 Расследаванні авіякатастроф.
12.40 Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога.
14.10 Неразгаданыя тайны «Лузітаніі».
14.55 Замагільны свет Егіпта.
15.40 Зграбленая грабніца Чынгісхана.
16.30, 2.25 Тайны старажытнасці.
17.15, 22.30, 4.50 Погляд знутры.
18.00, 23.20, 3.10 Першы імператар: сакрэты кітайскай грабніцы.
19.30 У пошуках Атлантыды.
20.20 Другая сусветная вайна.

### Discovery

8.00 Заваёўванне новых земляў.
11.00, 7.10 Не спрабуйце паўтарыць.
12.00, 21.00 Загадкі планеты Зямля.
13.00, 22.00 Бітвы робатаў.
14.00 Выжыць у дзікіх умовах.
15.00 Чыгунка Аўстраліі.
16.00, 23.00 Залатая ліхаманка.
17.00 Смяротны ўлоў.
18.00 Паляўнічы на антыкварыят.
19.00, 1.00 Металаломшчыкі.
20.00 Паляўнічыя на рэліквіі.
0.00 Махінатары.
2.00 Стальныя хлопцы.
4.40 Інжынерныя пралікі.

■ Простая мова

# На ўсё свой час

**Рыжы кот клубком скруціўся на рыжай траве. Гэта — восень**

## ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

Раніца, горад, аўтобус: людзей — што селядцоў, і тым, што сядзяць, яшчэ трохі лепей, хаця...

Адна з кабет ужо, мусіць, прыехала: устала і пайшла б да дзвярэй, ды дзе там — натоўп сцяной.

— Можа, ты сядзеш, — прапануючы сваё месца, пытае жанчына ў нейкага хлопца. — А я прайду...

— Не хачу, — адмаўляецца той.

— Хочаш не хочаш, — уздыхае жанчына, — а выйсця няма: сядзеш, сядзеш, як міленькі!

...Шмат значэнняў у гэтага слова: садзіць (саджаць) можна, у прыватнасці, дрэвы, гасцей, некага на пасаду, дыету, сабе на шыю, хлеб у печ, квактуху на яйкі, пляму — на сукенку... І чалавека...

Ну чаму нам здаецца, што найперш — у турму?

## ЯКАЯ СПРАВА, ТАКАЯ І СЛАВА

Міхайлавіч на «дзембель» сышоў (чытай — на заслужаны адпачынак), каторы месяц шчыруе на сябе, на патрэбы сям'і — найчасцей, вядома, на лецішчы. Але ж надоечы і ў горад сабраўся.

— На працу трэба, — сказаў суседу.

— Такі нешта знайшоў?! — не паверыў той. — А ці добрае ж?

— Ды яшчэ якое! Дома буду — канапу пільнаваць.

...Гэта, ну згадзіцеся, рэдкая праца! А каб за яе ды яшчэ і плацілі...

## АПТЫМІСТЫ

Супала: у прыяцелькі вольная хвілінка была, і візітоўкі пад руку «падкруціліся» — захацела перабраць, непатрэбныя выкінуць, папярэдне, вядома ж, парваўшы...

Думаеце, гэта лёгка?

Яна таксама думала. Але як ні старалася, некалькі паперак парваць не змагла!

Трэба разумець, іх заказчыкі грунтоўна падышлі да «вытворчасці»: усё зрабілі як мае быць! Думалі, відаць, што сваіх адказных пасад ніколі не страцяць, не захварэюць, на пенсію не пойдуць, за краты не сядуць...

Не прыходзіла на думку і тое, што гэтыя візітоўкі нехта банальна захоча выкінуць як непатрэбныя.

## СПАДЧЫНА

...«Вы ведаеце, чым дрэнная адзінота? — пытала некалі пісьменніца Лідзія Арабей. І сама ж адказвала. — Тым, што раніцай няма каму расказаць свой сон. А яны ж бываюць такія цікавыя!»

Мой нядаўні. Нейкі горад, свята, але яно як быццам скончылася — людзі разышліся, каб сядзець па дамах, хоць вечар — проста шыкоўны: ціхі, цёплы, у такія — гуляць ды гуляць, проста хадзіць па вуліцах!

Там відна, бо свецяць ліхтары, там, трэба разумець, бяспечна, бо дзяжурыць міліцыя, там — хай зрэдку — але ж відаць пастаці.

Адна насустрач: мужчына — сталага веку, усмешлівы, у прыгожым касцюме. Падобна — мэр? А бач ты — дэмакрат: пехатой, без аховы...

Мы ўсміхаемся адно аднаму, спыняемся, аб нечым размаўляем, смяёмся.

Мы заходзім у нейкае памяшканне кшталту мястэчковай чайной, дзе спадарожнік раптам... знікае.

Мне б зрабіць тое самае, гэта знаць — выйсці адсюль. Але дзе там — дарогу заступаюць нейкія «цэрберы»: адзін з іх ветліва «просіць» пачакаць (чаго? каго?), другі — з усёй сілы... штурхае.

Падаю. Падаю ў... ваду, але чамусьці не тану. Можна сказаць, не ўмеючы, плыву да «берага», і адзінае, чаго там не разумею — як жа быць з гэтай мокрай кофтай, спадніцай? Трохі выкруціць? Так.

Я спрабую гэта зрабіць, прычым не толькі сама: побач... мой спадарожнік. Праўда, цяпер ён ужо не ў касцюме, а ў ружовым махровым халаце, з пад якога відняюцца голыя грудзі, ногі.

Гэта відовішча віхрам зрывае з месца, гоніць па нейкім доўгім калідоры, па раскіданых дошках, брудных пакоях... У адным з якіх, можна сказаць, слупянею, бо там з дзясятак ложкаў і на кожным — маладыя, прыгожыя дзяўчаты. Усе яны нібы спяць. Толькі адна працягвае халодную, як лёд, руку і называе імя: «Наташа». Я пытаюся, хто яна і яны? Чаму не ўцякаюць? «А гэта немагчыма, — гаворыць дзяўчо. — Усе дзверы замкнутыя».

Не верачы ў гэта, б'юся ў іх плячом, кулакамі, нагамі, тузаю ручкі, крыкам крычу: «Памажыце!», «Ратуйце!..»

— Што з табой? — чую над вухам. — Нешта прыснілася?

— Так, мінулае стагоддзе... Рэпрэсіі.

Спадчына.

## НЯМА ЛЕПШАЙ РЭЧЫ?..

Гэта некалі мы лавілі таксі. Цяпер...

У аэрапорце хлопцаў злавіў таксіст, прапанаваў падвезці. Тыя селі.

— Нябось студэнты? — пацікавіўся кіроўца, акінуўшы іх уважлівым позіркам.

— Ну, — згодна кіўнулі дзецюкі і змоўклі, бо размаўляць зусім не хацелася.

— Працаваць недзе ездзілі? — не суцімаўся таксіст.

— Ну, — яшчэ раз кіўнулі студэнты.

— Некуды за мяжу?.. А чаму вярнуліся?

...У Гагарына, кажуць, пра тое ж пыталіся: як гэта — увесь свет абляцець і ў Савецкі Саюз вярнуцца?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## НЕ ВУЧЫ ВУЧОНАГА

У выдатнага мовазнаўцы Уладзіміра Даля неяк спыталі, якім чынам можна вызначыць нацыянальнасць чалавека.

Адказаў прыкладна так: не па месцы жыхарства, не па веравызнанні, не па паходжанні яго бацькоў — па *мове*, гэта значыць, на якой *мове* чалавек гэты думае і размаўляе, да той нацыі ён і належыць.

Адпаведна беларусаў у Беларусі вобмаль, а ўжо за межамі — і зусім не відаць. Там — у старажытных храмах, музейных залах, у атэлях і кавярнях, на гарачых пляжах і вузкіх турыстычных сцежках — шмат кітайцаў, японцаў, немцаў, палякаў...

Рускіх (дакладней — рускамоўных) — вядома ж, таксама шмат! І ўжо за імі назіраў бы і назіраў, бо цікава!

Такім чынам...

Варна, вакзал, чарга — прабачце — у прыбіральню.

Яна, што здалёк відаць, — платная. Што крыху бліжэй — грошы бярэ не жывы чалавек (як, напрыклад, у нас), а спецыяльны аўтамат: пяцьдзясят стацінак.

Пяцьдзясят дык пяцьдзясят — у нас яны ёсць. А авось кабета, што стаіць паблізу, пакуль у пошуку: нешта выграсае ў далонь з кашалька, шнарыць па кішэнях і (відаць, з надзеяй на кароткае «так» ці яшчэ карацейшае «не») уголас пытае:

— Скажыце, а калі я сто стацінак укіну, аўтамат гэты рэшту дасць?

Рот адкрыць ніхто не паспявае — слова бярэ (іначай не скажаш) адзін з мужчын:

— Вы, між іншым, не дома, а за граніцай, — цэдзіць ён праз зубы, гледзячы на кабету зверху. — Тут вашу рускую мову могуць не зразумець. Трэба гаварыць на англійскай...

На твары ў кабеты «букет» пачуццяў: найперш — разгубленасці (бо спытала дурное...), потым — згоды, бо яно ж і сапраўды, трэба па-англійску, потым — шкадобы, бо гэтай мовы яна, падобна, не ведае, а ўрэшце... палёгкі, бо ў кішэні нарэшце знаходзяцца пяцьдзясят стацінак, а з імі (як сякера пад лаўкай) і адказ маралісту:

— Пайшоў ты...

Куды канкрэтна — жанчына сказала, сказала настолькі гучна і нечакана, што ён пачырванеў, прыгнуўся і сапраўды... пайшоў — пайшоў за дзверы з літаркай «М».

Ці вам казаць, што чарга туды падыходзіць хутчэй.

## НА ЎСЁ СВОЙ ЧАС

...У садзе нагой не ступіць: за тыдзень нападала яблыкаў — жоўтых, спелых, сакаўных. З'еў бы, здаецца, усе, і на ўчарашні розум — дык пачаў бы з гэтых, трошкі пабітых (бо не паляжаць). А вось на сённяшні...

Гісторыю расказалі — пра мужыка, які вельмі любіў памідоры. І таму сам, уласнаручна, сеяў, вырошчваў расаду, пікіраваў яе, сам кожнае каліўца пераносіў у грунт, сам і ўсё лецейка песціўдагадаў.

Дзякаваць Богу, не марна: вырасціў ураджай — акуратненька сабраў яго, перанёс у хату і расклаў па падаконнях. Няхай, маўляў, паляжыць крыху, няхай сабе і людзям вочы пацешыць.

І ён, вядома ж, ляжаў. І цешыў, але да пары: неяк на адным з прыгажунчыкаў гаспадар заўважыў цёмную плямку.

Што было рабіць? Акуратненька выразаў яе, а памідорык з'еў.

Назаўтра яшчэ колькі штук аказаліся з плямамі — з'еў таксама, хоць яму, шчыра кажучы, шкада было. І на паслязаўтра...

Такім чынам, вельмі любячы памідоры, гэты агароднік еў — цягам тыдняў — не сказаць, што гнілыя, але ж...

Кабета, якая расказала гэту гісторыю, завяршыла яе нечакана: «У пару ўсё трэба... Нават любіць!»

А вы з ёй паспрачайцеся. Калі, вядома ж, хочаце!

## ГОЛАС

Міхайлаўна (здымаю капялюш) у першую суботу кастрычніка заўсёды тэлефануе сваім настаўніцам — віншуе з прафесійным святам, кажа, каб яшчэ і заўтра ўключылі радыё, бо для іх заказана песня...

Жанчыны, вядома ж, расчулены, рады. І найбольш, здаецца, адна. Кажа:

— Ірачка, дзіцятка...

Астатніх слоў былая вучаніца не чуе: для таго каб «аглухнуць», ёй хапае восем гэтага, аднаго, паўзабытага слова — слова, што казала ёй мама... Паўвека таму.

**Валянціна ДОЎНАР.**
dounar@zviazda.by

■ Неасабісты суб'ектыў

# ЗАМОРСКАЕ ШЧАСЦЕ



## Яно як экзатычны ласунак — знешне прывабнае, але ці варта каштаваць?

Вы, напэўна, ужо чулі гэту гісторыю, як беларускія і расійскія дыпламаты нашу суайчынніцу з дачкой з іарданскага «палону» вызвалялі. Амаль дэтэктыў, а што сцэнарыст серыяла можна пісаць — дык гэта дакладна. Пойдзе ў гледача на ўра, бо гісторыя хутчэй тыповая, а значыць, многім блізкая. Калі б не ўмяшанне шараыцкага суда Іарданіі, а пасля, як следства, — нашага МЗС, увогуле была б звычайнай, шчаслівай або не (хутчэй — апошняе).

Дык вось, паводле сцэнарыя (тут можна крыху пафантазіраваць, хоць падабязнасці невядомыя, але імавернасць таго, што было менавіта так, вельмі нават вялікая. Хаця б таму, што аўтарка гэтых радкоў не аднойчы станавілася сведкай, а, здаралася, без дзвюх хвілін дзеючай асобай падобнай гісторыі. Прынамсі пачынаюцца яны ўсе амаль аднолькава). Жыла-была дзяўчына, і ўсё было пры ёй — і прыгажосць, і розум. Не было толькі шчасця — такога, як у кіно ці ў кніжках, калі і кампліменты, і падарункі, і прагулкі ў рамантычнай атмасферы, і захапленне ў вачах таго, хто побач. (Думаю, суайчынніцы мяне падтрымаюць, калі скажу, што большасць нашых мужчын у плане заляцанняў — бы копы сена: гэткія самыя нехлямяжныя, маўклівыя і нерухавыя.)

Але дзяўчыне пашанцавала, і сустрэла яна палкага заморскага прынца з аксамітнымі вачыма (дзе сустрэла — тут могуць быць варыянты. Часцей — на адпачынку ў іншай краіне. Здараецца, праўда, зусім рэдка, што «прынцы» прыязджаюць да нас — вучыцца, напрыклад, як у нашай гісторыі). Прынц гаварыў шмат прыгожых слоў (калі слоў не хапала — гаварылі аксамітныя вочы), быў клапатлівым і пяшчотным. Той час, што яны былі разам, ператварыўся ў сапраўдную ўсходнюю казку. Але потым ім давялося развітацца, і засталіся ў памяці толькі шыкоўныя ўспаміны і даволі ілюзорная надзея на тое, што гісторыя калі-небудзь будзе мець працяг.

У нашым выпадку працяг яна займела вельмі драматычны. Спачатку дзяўчына нарадзіла дзіця ад той рамантычнай прыгоды, пасля аб'явіўся і яе галоўны персанаж. Ён запрасіў старую знаёмую прыехаць да яго ў госці з дачкой. Адпачыць у цікавай краіне, нічым не падобнай на Беларусь, ды яшчэ сустрэцца з героем свайго рамана — хто б не спакусіўся? У пачатку ўсё ішло вельмі добра, але, пэўна, ужо не пачуцці кіравалі сітуацыяй, бо каханкі пасварыліся. Прычым так, што «прынц», які ведаў, што дзіця ад яго, звярнуўся ў шарыяцкі суд — у свецкай Іарданіі ў момантах сямейнага права ён мае законную сілу — з тым, каб дачку прызналі яго дачкой, а маці дзяўчынкі — яго жонкай. (Пра згоду апошняй тут ужо ніхто не пытаўся.)

Доўжылася гэта гісторыя, якая з прыгоды ў адзін момант стала кашмарам, з пачатку жніўня. Мала таго, што грамадзянкі Беларусі не маглі выехаць на Радзіму — маці за гэты час пабывала пад арыштам, сямігадовая дзяўчынка — у прытулку, дзе не было ніводнага знаёмага твару і ўсе гаварылі па-арабску. А дома, у Мазыры, два месяцы не знаходзіла сабе месца яшчэ адна жанчына — мама і бабуля іарданскіх нявольніц.

Дзякуй Богу, усё скончылася добра. Беларускія дыпламаты задзейнічалі ўсе каналы і сувязі, каб вызваліць суайчынніц з гэтай неспадзяванай біды. Але ці стане яна ўрокам для сотнень дзяўчат і маладых жанчын, якія, бы ў вір галавой, кідаюцца ў рамантычныя прыгоды з заморскімі прынцамі — уладальнікамі стройнай постаці, аксамітна-чорных вачэй і меладычна-мяккага голасу? Разумееш, што наўрад, калі бачыш салодкія парачкі каля сталічных студэнцкіх інтэрнатаў. Пра турэцкія ды егіпецкія курорты нават згадваць не буду — хто хоць раз там быў, зразумее, пра што я.

Мне, дарэчы, у гэтым плане калісьці вельмі пашанцавала, бо руховыя акуляры толькі збіралася на нос начапіць, а тут з'явіўся чалавек, які іх забраў і ў незваротную далеч закінуў. Звалі яго — толькі не смейцеся! — Карым, і быў ён тунісім берберам. Прыгожы — вачэй не адвесці. Але на існуючую рэальнасць глядзеў абсалютна па-нашаму, па-славянску, — пяць гадоў варонежская журфака не прайшлі дарэмна. Быў ён нашым рускамоўным гідам па Сахары. Даведаўшыся, што я калега, а яшчэ, пэўна, злавіўшы мой амаль закаханы погляд, ён цэлы вечар... маляваў мне рэальную карціну таго, што адбываецца навокал. Лейтматывам гучала: ты прыехала ў абсалютна чужую краіну, маеш справу з людзьмі, пра традыцыі і лад жыцця якіх ведаеш у лепшым выпадку вельмі павярхоўна з мастацкіх твораў. Таму слухай, запамінай, назірай сама...

Шмат цікавых рэчаў я пачула ў той дзівосны вечар (мы сядзелі каля вогнішча ў халоднай пустыні, зоры былі так нізка, што можна было да іх дакрануцца, а голас у мужчыны быў мяккі, як і позірк яго зялёных вачэй). Напрыклад, пра тое, адкуль ва ўсходніх хлопцаў столькі нерастрачанай пяшчоты. У тым жа Тунісе, напрыклад, каб ажаніцца, трэба мець тры рэчы: машыну, кватэру і тэлевізар. Калі гэта праграма-мінімум не выканана — ні адзін бацька за цябе сваю дачку не аддасць. Мусульманскія дзяўчаты строгіх правіл, таму аб адносінах з імі да шлюбу і гаварыць не варта. У краіне беспрацоўе, і зарабіць нават на тэлевізар, не кажучы ўжо пра кватэру, шмат каму не ўдаецца. Карацей, тысячы маладых здаровых мужчын вымушаны жыць (выбачайце, гавару як ёсць) без сексу. Каб не даступных еўрапейкі, што прыязджаюць адпачываць, — зусім была б бяда. А гэтым некалькі слоў скажаш, у вочы пяшчотна глянеш — вынік амаль стопрацэнтны. Спрацоўвае не толькі дома, але і на выездзе: на захадзе мужыкі баяцца заляцацца, бо абвінавацяць у дамаганні, славяне ўвогуле сваіх прыгажунь не цэняць... Жаніцца? Ну, калі «пасагу» сабе так і не сабраў, можна і з «наташай». Праўда, падпарадкоўвацца яна будзе тваім законам і тваёй веры. І рабіць ты зможаш з ёй усё што захочаш...

Вось так і не атрымалася ў мяне ні тады, ні тым больш пасля гісторыі «як у кіно»... А калі падумаць, дык і нічога, што нашы дзяцюкі ў плане адносін з процілеглым полам сапраўды на копы сена падобныя. Яно, ведаеце, цёпла, утульна і прадказальна. А што яшчэ нам, дзяўчаты, для шчасця трэба?

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** alena@zviazda.by

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | **Мядельское райпо,** Минская область, г. Мядель, ул. 1 Мая, д. 2 | | |
| **Предмет аукциона – лоты №№1–4 (дата проведения 26.10.2016)** | | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Лот №1** | | | |
| **Одноэтажное бревенчатое облицованное кирпичом здание аптеки** | 125,7 кв.м | 633/С-6758 | Минская обл., Мядельский р-н, Будславский с/с, д. Будслав |
| Составные части и принадлежности | Пристройка, сарай, уборная, колодец | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен Продавцу пл. 0,0836 (га) на праве постоянного пользования для размещения объектов здравоохранения и предоставления социальных услуг с установленными ограничениями – водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос – реки Сервечь, пл. 0,0836 га | | | |
| **Начальная цена Лота №1 с НДС 20% – 8 800 руб. 00 коп. (снижена на 20%)** (88 000 000 бел. руб.) | | | |
| **Лот №2** | | | |
| **Магазин** | 61,2 кв.м | 633/С-10862 | Минская обл., г. Мядель, ул. Новая, д. 4а |
| Составные части и принадлежности | Две пристройки, склад | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен Продавцу пл. 0,0579 (га) на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли с установленными ограничениями – водоохранная зона озера Мястро, пл. 0,0579 га | | | |
| **Начальная цена Лота №2 с НДС 20% – 5 600 руб. 00 коп. (снижена на 20%)** (56 000 000 бел. руб.) | | | |
| **Лот №3** | | | |
| **Кафе «Над озером»** | 234,3 кв.м | 633/С-11803 | Минская обл., Мядельский р-н, Нарочский с/с, д. Черевки, пер. Центральная, д. 67 |
| Составные части и принадлежности | две беседки, покрытие из бетонной плитки | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания кафе пл. 0,1300 га с установленными ограничениями – водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос – озера Нарочь (пл. 0,100 га) | | | |
| **Начальная цена Лота № 3 с НДС 20% – 30 000 руб. 00 коп. (снижена на 70%)** (300 000 000 бел. руб.) | | | |
| **Лот №4** | | | |
| **Здание магазина «Хозтовары»** | 165,7 кв.м | 633/С-13214 | Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, аг. Княгинин, ул. Полевая, 10А |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен Продавцу пл. 0,0545 (га) на праве аренды (срок действия по 08.01.2113) для обслуживания зданий и сооружений магазина «Хозтовары» | | | |
| **Начальная цена Лота № 4 с НДС 20% – 8 000 руб. 00 коп. (снижена на 20%)** (80 000 000 бел. руб.) | | | |
| **Дата и время проведения аукциона по лотам №№1-4** | **26.10.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов по лотам №№1-4** | **24.10.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |

| | | |
|---|---|---|
| **Предмет аукциона – артскважина (дата проведения 10.11.2016)** | | |
| Наименование | Инвентарный номер | Адрес |
| **Артскважина** | 633/С-11169 | Минская обл., Мядельский р-н, к.п. Нарочь, ул. Песчаная, д. 21 |
| ***Сведения о земельном участке:*** для обслуживания зданий и сооружений продавцу предоставлен на праве постоянного пользования земельный участок пл. 0,2783 га. Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона озера Нарочь | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 17 000 руб. 00 коп.** (170 000 000 бел. руб.) | | |
| **Дата и время проведения аукциона по артскважине** | **10.11.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| **Дата и время окончания приема документов по артскважине** | **08.11.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | |
| Срок подписания договора купли-продажи | **15** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда»: **по лотам №№1–3 и артскважине – 04.08.2016, по лоту №4 – 27.08.2016** | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** | |

Уважаемые акционеры

## ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»

**21.10.2016 года в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров по адресу: г. Гомель, ул. Лещинская, 49**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об уменьшении уставного фонда общества путем аннулирования акций, приобретенных акционерным обществом.
2. Об утверждении Устава общества в новой редакции.
3. О выплате дивидендов.

Регистрация участников собрания с 13.30 до 14.00 по месту проведения собрания. При себе иметь: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность. Список акционеров общества, имеющих право на участие в собрании, будет составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на 12 октября 2016 года.

С материалами к собранию можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 13 октября 2016 года по месту нахождения общества с 10.00 до 16.00. Справки по телефону: 441017.

УНП 400078768

## ИНФОРМАЦИЯ О ФОРМИРОВАНИИ РЕЕСТРА ВЛАДЕЛЬЦЕВ ЦЕННЫХ БУМАГ

**Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»,** ул. Лещинская, 49, г. Гомель, Республика Беларусь, 246008, информирует о формировании реестра владельцев ценных бумаг для составления списка лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров на дату 12 октября 2016 года. Решения принято наблюдательным советом 06 октября 2016 года.

УНП 400078768

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | **Минское районное потребительское общество,** г. Минск, ул. П. Бровки, 24 | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Лот № 1** | | | |
| **Магазин** | 104,4 кв.м | 600/С-103784 | Минский р-н, Щомыслицкий с/с, д. Заболотье |
| Составные части и принадлежности: сарай, уборная | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0820 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина. | | | |
| **Начальная цена лота №1 с НДС 20% – 32 725 руб. 00 коп. (снижена на 15%)** (327 250 000 бел. руб.) | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Здание магазина №70** | 92,1 кв.м | 600/С-134991 | Минский р-н, Михановичский с/с, д. Михановичи |
| Составные части и принадлежности: две пристройки, сарай, крыльцо, рампа | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,0581 га предоставлен на праве аренды сроком по 07.11.2041 для обслуживания здания магазина №70 с установленными ограничениями (водоохранная зона водных объектов). | | | |
| **Начальная цена лота №2 с НДС 20% – 14 500 руб. 00 коп. (снижена на 15%)** (145 000 000 бел. руб.) | | | |
| **Лот № 3** | | | |
| **Здание магазина** | 71,1 кв.м | 600/С-150281 | Минский р-н, г. Заславль, ул. Приморская, 1А |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,0156 га предоставлен на праве аренды сроком по 06.08.2042 для обслуживания здания магазина с установленными ограничениями (водоохранная зона водных объектов). | | | |
| **Начальная цена лота №3 с НДС 20% – 9 900 руб. 00 коп. (снижена на 75%)** (99 000 000 бел. руб.) | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
